

ТОРФ – ПАЛІВА, УДАБРЭННЕ І ХАРЧАВАННЕ 7

СУЧАСНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ: ВІРТУАЛЬНЫЯ СЭРВІСЫ І ПАПЯРОВЫЯ КНІГІ 11





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2021 г. АЎТОРАК № 211 (29580)


# Восем работ Сцяпана Лявіцкага



Пятнаццаць гадоў Сцяпан ЛЯВІЦКІ аддана працуе трактарыстам у сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Козенкі-Агра» Мазырскага раёна, лічыцца адным з найлепшых спецыялістаў калектыву. Такую адзнаку мае нездарма: давераную яму тэхніку ведае добра, любіць і беражэ, своечасова праводзіць агляд і належнае абслугоўванне. Можна сказаць, тэхніка яго рукі «слухае» і не падводзіць, у гарачы час працы не прастойвае. Вясной на энерганасычаным МТЗ 3022 Сцяпан Фёдаравіч працуе на палях — на ворыве, баранаванні і сяўбе, у летне-восеньскі перыяд шчыруе то на зерняўборачным камбайне КЗС-12 на жніве, то на «Ягуары» на касавіцы і ўборцы кукурузы. І зімою не адпачывае: на фермы падвозіць корм для жывёл, вывозіць арганіку. І адначасова рыхтуе свой «аўтапарк» на наступную сяўбу і нарыхтоўчы сезон. Мне давялося сустрэцца з козенскім трактарыстам у полі, якое ён рыхтаваў пад будучы ўраджай. Усяго толькі на пяць хвілін ён спыніў свой магутны агрэгат, каб павітацца, сказаць некалькі слоў і сфатаграфавацца. А далей — зноў у поле, дзе яго чакала неадкладная праца. Бо нездарма ж кажуць: восень — работ восем. А ў нашага героя так — увесь год.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХУДЫК, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«У Беларусі за год утвараецца каля 4 млн тон камунальных адходаў, з іх амаль 280 тыс. тон — пластыкавыя. Краіна займае лідзіруючыя пазіцыі на постсавецкай прасторы па развіцці сферы абыходжання з адходамі. У нас найлепшы паказчык па ўцягванні ў гаспадарчы абарот камунальных адходаў. Сёлета мы плануем атрымаць каля 30 працэнтаў уключэння ў гаспадарчы абарот. Гэтыя пытанні стаяць на самым высокім кантролі. Кіраўнік дзяржавы, урад паставілі вельмі сур'ёзныя задачы: да 2030 года мы плануем уключыць у гаспадарчы абарот 79 працэнтаў камунальных адходаў, да 2035 года — 90 працэнтаў. Ёсць канкрэтныя мерапрыемствы, распрацаваныя для ўсіх дзяржаўных органаў кіравання. Мы маем намер гэтую задачу выканаць».*

## КОРАТКА

- **Перыяд абмену банкнотаў узору 2000 года завершыцца 31 снежня.**
- Ідэя Банк далучыўся да МТБанка.
- **Самай народнай маркай легкавога аўтамабіля ў асабістай уласнасці беларусаў у 2020 годзе быў «Фольксваген».**
- Беларускія вучоныя распрацоўваюць камбінаваны экспрэс-тэст для вызначэння каранавіруса і грыпу.
- **У Мінскім заапарку ў лістападзе правядуць бясплатныя экскурсіі.**


ISSN 1990 — 763X


Пуцёўка ў жыццё

## Дзе вучаць вырабляць аўтарскія цукеркі



**Віцебскі дзяржаўны індустрыяльны каледж працуе толькі з пачатку сёлетняга вучэбнага года. Аднак ахвотных вучыцца тут па некаторых спецыяльнасцях больш, чым у прэстыжных універсітэтах краіны: конкурс два з паловай чалавекі на месца. Попыт на выпускнікоў перавышае прапанову ў чатыры разы. У гэтай установе адукацыі рэалізоўваюць пілотны праект «Інклюзіўны касір», дзякуючы якому людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць атрымаць запатрабаваную кваліфікацыю і ўладкавацца на працу ў адзін з самых буйных у Беларусі гандлёвых рытэйлераў.**


СТАР. 4


Праведзена праз сябе

## ДЫХАЦЬ ПАВЕТРАМ НАПОЎНІЦУ

### Гісторыя жанчыны, якая пераадолела цяжкую форму ковіду і змяніла стаўленне да жыцця

**Цяпер Каця ідзе на работу крыху не так, як раней. Выходзіць загадзя знарок, каб дарога займала крыху больш часу. Няспешна разглядае наваколле, можа спыніцца, каб паглядзець на незвычайнай прыгажосці дрэва ў асеннім уборы, заўважае маленькую птушачку на галіне, цікаўнага ката з суседняга дома. «Людзі, якія трапляюцца насустрач, мабыць, думаюць, што ў гэтай жанчыны не ўсё ў парадку з галавой, — смяецца яна. — Ідзе-ідзе і раптам спыніцца. А я хачу нагледзецца прыгажосцю, надыхацца паветрам. У звычайным жыцці мы не ведаем, якая гэта раскоша — дыхаць напоўніцу».**

Каця нашмат маладзейшая за мяне. Ведаю яе яшчэ з тых часоў, калі яна бегала па калідорах рэдакцыі абласной газеты юнай сімпатычнай практыканткай, працавала ў адной з газет нашага Дома друку. Потым пераязджала ў розныя гарады па сямейных абставінах. Цяпер яна працуе ў газеце аднаго з райцэнтраў, гадуе з мужам дваіх дзяцей. А недзе ў лютым ад калег я выпадкова пачула, што Кацярына вельмі цяжка перахварэла. Пазваніла, каб падтрымаць. З той пары мы шмат разоў размаўлялі. Аднойчы не вельмі ўпэўнена спытала, ці можна напісаць, падзяліцца з чытачамі фрагментамі тых размоў. Яна адразу пагадзілася, сказала, што, мабыць, каго з чытачоў гэта падштурхне на большы клопат пра сябе альбо пра сваіх бацькоў.


СТАР. 5

З першых вуснаў

# «Там, дзе ёсць парадак, дысцыпліна, тэхналогіі, там будзе вынік»

**Рабочыя камандзіроўкі Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі па краіне працягваюцца ў выхадныя. У суботу кіраўнік краіны наведаў малочнатаварны комплекс «Вусценскі» ў Аршанскім раёне, вытворчае прадпрыемства якога належыць Нацыянальнай акадэміі навук.**

У 2015 годзе Прэзідэнт даручыў перадаць адстаючае вытворчае прадпрыемства «Вусце» Аршанскага раёна навукоўцам. У савецкія гады гаспадарка была адной з самых перадавых, але з цягам часу прыйшла ў занапад.

Як далажыў кіраўніку дзяржавы Старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір Гусакоў, цяпер гаспадарка становіцца на ногі, самастойна зарабляе грошы, паказчыкі штогод растуць. «Мы яе прынялі ў вельмі непрыглядным выглядзе. Пачалі аднаўленне з раслінаводства: выраўнавалі і ўзбуйнілі палі, распрацавалі новую сістэму севазвароту, далі самыя новыя сарты. Атрымалі добрую прадукцыйнасць, і гэта дазволіла аднавіць галіну жывёлагадоўлі», — сказаў ён.

Прэзідэнт падагульніў: шматгаліновая гаспадарка — гэта ўзор развіцця не толькі для Віцебскай вобласці, але і ў цэлым для Беларусі. Кіраўнік Акадэміі навук прызнаўся: у НАН спачатку перажывалі, што ім перадалі на аднаўленне такое занядбанае прадпрыемства, але цяпер беларускія вучоныя ўжо не хочуць яго нікому аддаваць і задумваюцца аб яшчэ адным такім комплексе, але патрэбна падтрымка дзяржавы. «Лічы і называй мне цану. Трэба аптымальна падыходзіць. Калі спатрэбіцца кавалак зямлі, я падкажу», — канстатаваў Прэзідэнт.

Недалёка ад фермы пабудаваны інавацыйны комплекс для падрыхтоўкі насення сельскагаспадарчых раслін. Ён таксама належыць прадпрыемству «Вусце». Завод можа поўнасцю забяспечваць патрэбы ў насенні Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Кіраўнік дзяржавы даручыў прапрацаваць пытанне будаўніцтва такіх комплексаў у іншых абласцях. «Патрэбны ўсюды тэхналогіі, на ўсіх этапах», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з гадоўляй племянной чырвонай дацкай пароды, выкарыстаннем інавацыйнага дальнага абсталявання і прадэгуставаў прадукцыю з малака незвычайных кароў. Кіраўнік дзяржавы цікавіўся ўмовамі ўтрымання жывёл, асаблівасцямі іх гадоўлі.

Пасля наведвання МТК Аляксандр Лукашэнка зрабіў высnову, што яшчэ адной такой гаспадарцы быць. «Гэта будучыня», — заявіў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што вопыт варта распаўсюдзіць па рэгіёнах.

«Перш чым на кавалкі парэзаць зямлю сельгаспрызначэння і аддаць фермерам у прыватызацыю, трэба паспрабаваць самім, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Там, дзе ёсць парадак, дысцыпліна, тэхналогіі, там будзе вынік. Няважна, прыватная або дзяржаўная ўласнасць. Я не супраць той, не супраць гэтай. Але трэба падыходзіць справядліва, перш чым парэзаць на кавалкі зямлю і некаму раздаць».

Парламенцкі дзённік

# УНЕСЕНЫ ЗМЕНЫ Ў ЗАКОНЫ

**На чарговым пасяджэнні шостай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання сенатары зацвердзілі важныя законапраекты і разгледзелі шэраг іншых пытанняў.**

Разгляд праекта закона «Аб турызме» выклікаў вялікую цікавасць у сенатараў і шэраг пытанняў з іх боку да міністра спорту і турызму Сяргея Кавальчука, у тым ліку і ад Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качановай.

Нагадаем, што дадзены законапраект спарадзіў шмат спрэчак і даволі працяглую дыскусію сярод уласнікаў, кіраўнікоў, работнікаў турфірмаў і іншых зацікаўленых асоб. Яны ўважліва сачылі за яго падрыхтоўкай і праходжаннем у абедзвюх палатах парламента.

Невыпадкова напярэдадні сесіі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч правёў нараду па пытаннях развіцця ўнутранага і міжнароднага турызму.

Віктар Лісковіч адзначыў запатрабаванасць гэтага законапраекта ў грамадстве, бо ён дазволіць больш поўна, глыбока і канцэптуальна падыходзіць да фарміравання турыстычнай дзейнасці ў нашай краіне. На яго думку, сёння Беларусь вельмі прывабная з пункту гледжання турызму як для нашых грамадзян, так і для іншаземцаў. Але неабходна засцерагчы нашых грамадзян ад розных непрыемных сітуацый, магчымых пры атрыманні турыстычных паслуг. Ён падкрэсліў, што законам прадугледжана фінансавая адказнасць тураператараў. Гэта можа быць страхаванне, нейкія фонды тураператараў і банкаўскія гарантыі. Таксама прадугледжваецца ўрэгуляванне спрэчак паміж тураператарамі і спажыўцамі турыстычных паслуг, паведаміў Віктар Лісковіч.

Сенатары разгледзелі праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў)». І дакладчык, намеснік старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый Лапко, і судакладчык, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец, абгрунтавалі актуальнасць змен у справе кампенсацыі банкаўскіх укладаў для юрыдычных і фізічных асоб. Таццяна Рунец выказала ўпэўненасць, што гэтыя змены ўмацуюць давер да банкаўскай сістэмы Беларусі з боку яе грамадзян, бо кампенсацыя ўкладаў у поўным аб'ёме гарантуецца.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Кантэкст

# МАТРЫЦА ХЛУСНІ

**У Італіі напрыканцы мінулага тыдня адбыліся два важныя міжнародныя форумы. Распіяраны саміт G20 прайшоў у Рыме, на яго з'ехаліся лідары краін «вялікай дваццаткі». Праўда, не ўсе. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і старшыня КНР Сі Цзіньпін у Рым не прыехалі і прысутнічалі на саміце віртуальна — па відэасувязі.**

Рознагалоссі па ключавых пытаннях — каранавірусе і глабальным размеркаванні вакцын, інфляцыі і цэнах на энерганосьбіты, барацьбе са змяненнем клімату і скарачэнні субсідый на здабычу выкапнёвага паліва — сусветным лідарам перaадолець так і не ўдалося, заўважыла найбуйнейшая нямецкая штодзённая газета Süddeutsche Zeitung. У выніковай дэкларацыі заставалася мноства квадратных дужак, якія ўласна гэтыя рознагалоссі яскрава сімвалізавалі.

Саміт G20, які прайшоў у Рыме, не апраўдаў чаканняў у плане барацьбы са зменамі клімату. Пра гэта заявіў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш. Яго словы прыводзіць ТАСС. «Хоць я вітаю пацвярджэнне G20 прыхільнасці пошуку глабальных рашэнняў, я з'язджаю з Рыма з неапраўданымі надзеямі», — напісаў ён у Twitter.

«Апошнія падзеі ў краінах калектыўнага Захаду, НАТА і Украіне паказваюць нежыццяздольнасць гэтых гібрыдных утварэнняў і па сваёй сутнасці квазідзяржаў у правядзенні сваёй незалежнай палітыкі і адстойванні нацыянальных інтарэсаў. Гіпертрафіраванае ўяўленне сваёй ролі і свайго месца ў свеце прывяло іх да палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і маральнага банкруцтва. Пасяджэнне G20 пацвярджае наяўнасць мноства праблем і нежаданне ў большасці яго ўдзельнікаў вырашаць іх разам. Пратэкцыянізм, нядобрасумленная канкурэнцыя, навязванне сваіх інтарэсаў іншым вымушаюць многіх думаць аб заключэнні такіх саюзаў дзяржаў, якія адпавядалі б сучасным патрабаванням і не парушалі суверэннасці краін. Нават тое, што Беларусь па ўсіх напрамках і ва ўсіх сферах дзейнасці стала палітычна і эканамічна мацнейшай, структурна-функцыянальна больш эфектыўнай, ужо з'яўляецца раздражняльным фактарам для «партнёраў», — адзначыў БелТА загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін.

Заходнія палітыкі ў прыняцці рашэнняў аб увядзенні санкцый несамастойныя, яны выконваюць волю атлантычнага лобі, якое імкнецца ўстараняць канкурэнтаў. Такое меркаванне выказаў БелТА прэзідэнт асацыяцыі «Пазнаём Еўразію», старшыня савета дырэктараў АТ «Банк Інтэза», прафесар Антоніа Фаліка падчас XIV Еўразійскага эканамічнага форуму, які прайшоў у Вероне. Ён сабраў на адной пляцоўцы вядомых палітыкаў, бізнесменаў і грамадскіх дзеячаў з многіх краін Еўропы і Азіі, якія абмяркоўваюць шырокае кола практычных пытанняў і актуальных праблем у галіне эканомікі і фінансаў, аховы здароўя, экалогіі, энергетыкі і тэхналагічных інавацый на прасторы Вялікай Еўразіі, аб'яднаных у гэтым годзе глабальнай тэмай: «Еўразія на шляху да новага геапалітычнага і сацыяльна-эканамічнага парадку: пераход да новай эканомікі, арыентаванай на чалавека».

«Неаліберальная заходняя сістэма прывяла да з'яўлення такой структуры грамадства, якую мы называем постдэмакратычнай, — сказаў Антоніа Фаліка. — Гэта фармальная дэмакратыя, і па меры развіцця крызісу ўся гэта сістэма аказалася нявольнікам лабісцкіх груп. Не зусім дакладна, спрашчаючы, можна было б назваць гэта лобі атлантычным». Прафесар сцвярджае, што заходнія палітыкі выконваюць волю лабістаў. «На паверхні можа здацца, што вызначаюць правілы гульні палітыкі, — адзначыў ён. — Але насамрэч гэта розныя групы ў атлантычным сегменце, што выпрацоўваюць такія рашэнні, якія потым ставяць палітыкаў у становішча, калі яны вымушаны прымаць гэтыя рашэнні. Але, па сутнасці, яны накіраваны на тое, каб устараняць канкурэнцыю. Сапраўднай палітыкі няма. Таму што палітыка не толькі ў тым, каб разумець настрой уласнага народа, але і паказваць яму шляхі, як ён будзе суіснаваць з іншымі народамі і як будзе знаходзіць сабе месца ў свеце. Таму менавіта гэтыя лабісцкія групы, якія ўмацаваліся ў атлантычным сегменце, з'яўляюцца крыніцай тых санкцый, з дапамогай якіх хочуць аслабіць Кітай, Расію, а цяпер і Беларусь».

У кулуарах XIV Еўразійскага эканамічнага форуму прадстаўнікі еўрапейскіх краін цікавіліся, як Беларусі ўдаецца абыходзіцца ва ўмовах пандэміі без лакдаўнаў. Аб гэтым БелТА расказаў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч, які ўзяў удзел у аўтарытэтным міжнародным мерапрыемстве. «На палях форуму яго ўдзельнікаў цікавіць беларускі вопыт, як нам удаецца прайсці пандэмію без лакдаўнаў і без спынення эканамічнага жыцця з паказчыкамі росту ВУП, знешнегандлёвага балансу, скарачэння дэфіцыту бюджэту», — сказаў Уладзімір Улаховіч.

Паводле яго слоў, у цэлым веронскі форум адлюстраваў значныя змяненні ў міжнародных эканамічных адносінах. «Мы бачым новыя, прагматычныя, разумныя падыходы, — сказаў старшыня БелГПП. — Мы бачым цікавасць да нашай еўразійскай «пяцёркі», якая крок за крокам, спакойна, устойліва развіваецца. Цікавасць узрастае як да вельмі сур'ёзнага, значнага партнёра — і з пункту гледжання ёмістасці рынку, і з пункту гледжання вялікіх рэсурсаў і патэнцыялу, які маюць нашы пяць краін. Ну а Беларусь — гэта асаблівы прамысловы кластар. Мы не толькі тэрыторыя лагістычнага, транспартнага спалучэння — мы захоўваем статус прамысловага сэрца Еўразійскага эканамічнага саюза. Роля Беларусі для многіх сёння адкрываецца па-новаму, мы гэта бачым і адчуваем па стаўленні да нас еўрапейскага бізнесу».

> **Рознагалоссі па ключавых пытаннях — каранавірусе і глабальным размеркаванні вакцын, інфляцыі і цэнах на энерганосьбіты, барацьбе са змяненнем клімату і скарачэнні субсідый на здабычу выкапнёвага паліва — сусветным лідарам пераадолець так і не ўдалося.**

Уладзімір Улаховіч нагадаў, што паміж БелГПП і арганізатарамі веронскага форуму Банкам «Інтэза» і асацыяцыяй «Пазнаём Еўразію» падпісана пагадненне аб стварэнні беларуска-італьянскага дзелавога савета. Паводле яго слоў, беларускі бок мае намер выкарыстоўваць веронскую пляцоўку для арганізацыі сустрэч з беларускімі бізнес-коламі. «Думаю, што гэта хутка адбудзецца, — выказаў надзею кіраўнік БелГПП. — Інтарэс да Беларусі толькі ўзрастае, я думаю, у найбліжэйшы час ён проста пяройдзе ў такую практычную плоскасць».

Уладзімір Улаховіч таксама звярнуў увагу, што на форуме ў Вероне многія выступоўцы выказаліся на тэму санкцый. «Адносна санкцый вы, напэўна, чулі, што гавораць нашы еўрапейскія партнёры і вядомыя людзі, кіраўнікі найбуйнейшых кампаній і дзяржаўных інстытутаў: санкцыі наогул нікому не прыносяць ніякай карысці, і гэта інструменты, якія трэба спісаць і забыць», — падкрэсліў ён. Увядзенне такіх абмежаванняў заходнімі краінамі супраць іншых дзяржаў засноўваецца на матрыцы хлусні, заявіў прафесар Антоніа Фаліка. У сваю чаргу мэр Вероны Федэрыка Збаарына заклікаў адмовіцца ад санкцый і эмбарга.

Ёсць канкрэтныя прыклады канструктыўнага ўзаемадзеяння краін. Геапалітычным феноменам у сваёй паспяховасці, рэзультатыўнасці, сацыяльнай арыентаванасці і раўнапраўі абодвух бакоў для ўсёй сусветнай грамадскасці, паводле меркавання Мікалая Шчокіна, стала Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. «Яскравым доказам жыццяздольнасці Саюзнай дзяржавы з'яўляецца нервовае стаўленне калектыўнага Захаду, якое мяжуе з абсурднасцю ў прыманых рашэннях. Пашырэнне інфраструктуры НАТА, санкцыйны ціск і шантаж, пастаянныя спробы ўнесці раскол у грамадства як Беларусі, так і Расіі сведчаць аб паталагічнай боязі ўмацавання саюза. Некаторая інтэлектуальная абмежаванасць і фобіі палітычных эліт заходнееўрапейскіх краін не даюць ім магчымасці рацыянальна ўсвядоміць згубнасць сваіх дзеянняў і катастрафічныя наступствы для грамадзян Захаду», — заўважыў эксперт.

**Пётр ДУНЬКО.**

На кантролі

# ЧАС ЗАЛАТОГА ЗЕРНЯ

**Анатоль ІСАЧАНКА, упаўнаважаны Прэзідэнта па Мінскай вобласці, днямі з зямлі і паветра маніторыў, як ідзе ўборка кукурузы.**


Фота БелТА.

Ён акцэнтаваў увагу на неабходнасці няўхільна і своечасова выконваць даручэнні Прэзідэнта, якія былі агучаны наконт уборкі кукурузы і завяршэння ўздыму зябліва ў сталічным рэгіёне.

— Гэта знаходзіцца на штодзённым кантролі. Пасля аблёту тэрыторый вобласці мы бачым, дзе ёсць канкрэтныя недахопы і адставанне, — адзначыў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Дарэчы, з неба Анатоль Ісачанка ацаніў сітуацыю ў Слуцкім, Салігорскім і Старадарожскім раёнах вобласці.

У якасці прыкладу ён прывёў Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці, дзе сельскагаспадарчыя работы блізяцца да завяршэння.

А вось ход работ з зямлі сенатар убачыў падчас рабочай паездкі ва Уздзенскі і Дзяржынскі раёны.

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі адзначыў, што ў рэгіёне засталося ўбраць 14 тысяч гектараў кукурузы на збожжа.

У дзень убіраецца каля 2,2—2,3 тысячы гектараў. Калі лічыць арыфметычна, то ўсё і складваецца. Але трэба дакладна разумець, што гэта «сярэдняя тэмпература па шпіталі». То-бок ёсць шэраг гаспадарак, якія ўжо завяршылі ўборку на зерне, але ў некаторых гаспадарках яна яшчэ працягваецца. На мой погляд, тут трэба больш рашэнняў, арганізацыйных мерапрыемстваў для таго, каб паскорыць уборку ў тых гаспадарках, дзе яна затрымліваецца, — патлумачыў віцэ-спікер.

І тут ёсць некалькі аспектаў, якія трэба мець на ўвазе. Па-першае, гаворка ідзе аб перакідцы тэхнікі, найперш камбайнаў. Так практыкуюць у Стаўбцоўскім раёне, дзе з гаспадаркі ў гаспадарку накіроўваюцца камбайны, каб паскорыць уборку кукурузы на збожжа.

Па-другое, лічыць сенатар, трэба сачыць за адвозам збожжа, каб таксама камбайны не прастойвалі. І апошні важны момант датычыцца сушкі збожжа:

— Тут выкарыстоўваецца некалькі тэхналогій, задзейнічаны ўсе механізмы. Мяркую, з улікам перакідвання камбайнаў у тыя тэрміны, якія пазначыў кіраўнік дзяржавы, Мінская вобласць павінна ўкласціся, — выказаў упэўненасць віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Акрамя таго, адным з важных кірункаў уборачнай кампаніі Анатоль Ісачанка лічыць уздым зябліва.

Паводле яго слоў, праца тут таксама ідзе, але ўзмацніць яе трэба: у цэлым працуюць больш за 500 трактароў, а ў дзень неабходна араць прыкладна 11 тысяч гектараў. Для таго каб справіцца з пастаўленай задачай, там, дзе ёсць неабходнасць, трэба падключаць больш механізатараў, арганізаваць начныя змены, лічыць Анатоль Ісачанка.

— Вядома, для гэтага патрабуюцца кадры і адпаведная заработная плата. У вобласці ўсё неабходнае для гэтага ёсць, і трэба арганізоўваць дадзеную працу, — падкрэсліў ён і дадаў, што выкананне пастаўленых Прэзідэнтам задач — прынцыповае пытанне, і гэта зона персанальнай адказнасці кожнага кіраўніка.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Надвор'е

# Цёплыя дажджы, пакуль цёплыя

Першая дэкада лістапада будзе цяплейшая, чым звычайна

**Увесь мінулы кастрычнік быў далёка не самы цёплы, але калі ўзяць сярэднюю тэмпературу па краіне, то адпавядаў кліматычнай норме. Па ападках другі месяц восені быў сухі: на большай частцы тэрыторыі краіны сума дажджоў склала ўсяго ад адзінкі да 45 % нормы, толькі па поўначы краіны выпала ад 50 % да 70 % сярэдніх шматгадовых значэнняў. Пры гэтым больш за ўсё ападкаў выпала на метэастанцыі Езярышча — 47,6 мм, або 72 % месячнай нормы, а вось на метэастанцыі Брагін за ўвесь кастрычнік істотных ападкаў наогул не адзначалася. Так што дажджы ў нас сталі доўгачаканымі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Як адзначаюць айчынныя сіноптыкі, першыя дні лістапада будуць халаднейшыя за мінулыя выхадныя, але ўсё ж цяплейшыя, згодна з кліматычнай нормай. Але разам з цяплом да нас прыйдуць ападкі. Гэтымі днямі павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць, пройдуць дажджы рознай інтэнсіўнасці і працягласці.

Удзень па краіне ў аўторак пройдуць невялікія дажджы. У асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень па заходняй палове месцамі парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 6 да 12 градусаў цяпла. У сераду часам пройдуць дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвай чвэрці ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—8 градусаў. Удзень будзе 7—13 цяпла.

А ў чацвер месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах прагназуецца туман. Вецер будзе паўднёвай чвэрці ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 градусаў да 7 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да 8—15 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень месцамі чакаецца ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 да 12 градусаў цяпла. Удзень будзе 9—15 градусаў вышэй за нуль, а па паўднёвым усходзе краіны прыгрэе да плюс 18.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Медыяпрастора

# ПРАФЕСАР І ЯГО СПАДЧЫНА

На факультэце журналістыкі БДУ прэзентавалі кнігу «Памяць і слава: Барыс Васільевіч Стральцоў»

**Вядомы беларускі журналіст і навуковец, які стаяў каля вытокаў нацыянальнай журналістыкі, мог адзначыць свой юбілей акурат у год стагоддзя Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 1 сакавіка Барысу Стральцову споўнілася б 95 гадоў. З нагоды юбілею доктара філалагічных навук, прафесара супрацоўнікі кафедры медыялогіі падрыхтавалі і выпусцілі кнігу, прысвечаную патрыярху айчыннай журналістыкі і свайму Настаўніку.**


**Вучань прафесара, кандыдат філалагічных навук Васіль Пятровіч ВАРАБ'ЁЎ.**

— Кніга, прысвечаная прафесару, стала першым выданнем серыі «Памяць і слава» на факультэце журналістыкі БДУ, — адзначае **ўкладальнік кнігі, загадчыца кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Наталля ФЯДОТАВА.** — Барыс Стральцоў быў і застаецца адным з заснавальнікаў беларускай школы вывучэння журналістыкі. Таму для мяне, як яго вучаніцы, было важна, каб менавіта прафесар Стральцоў распачынаў памятную серыю кніг аб прафесуры, якая складае гісторыю і славу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У кнізе атрымаў новае жыццё вучэбны дапаможнік «Метад і жанр» аб асновах журналісцкага майстэрства. Тут сабраны і абразкі, а таксама развагі прафесара Стральцова аб жыцці, прафесіі, апублікаваныя ў «Звяздзе» ў розныя гады. Можна знайсці і поўную бібліяграфію навуковых, педагагічных і публіцыстычных матэрыялаў вучонага. Асаблівы раздзел — успаміны пра Барыса Васільевіча яго калег, сяброў і вучняў.

Барыс Стральцоў вядомы не толькі як тэарэтык журналістыкі — не адно пакаленне супрацоўнікаў СМІ вучылася па яго падручніках. Ён быў таленавітым журналістам (працаваў, дарэчы, і ў «Чырвонай змене», і ў «Звяздзе»).

Працуючы ў «Звяздзе», якой аддаў 11 гадоў, здолеў напісаць і абараніць кандыдацкую дысертацыю. Пайшоў з найстарэйшай беларускай газеты па ўласным жаданні. Прафесар заўсёды быў шчырым, сваё рашэнне патлумачыў і тут — стаміўся. «Гэта трэба было напрацавацца ў газеце, «аб'есціся» ёю, — праз гады аналізаваў сваё рашэнне Барыс Стральцоў. — Журналіст — гэта ж не пісьменнік, які чакае натхнення. Калі нешта не атрымліваецца, пісьменнік пакладзе рукапіс у стол — паходзіць, з сябрамі пасядзіць... А журналіст увесь час працуе, што называецца, «з-пад капыта»: выпуск газеты не адкладзеш. Бывалі моманты: так напрацуешся, што робіцца страшна садзіцца за стол. Ад адной думкі, што трэба пісаць, — валасы дыба...»

Барыс Стральцоў быў заслужаным дзеячам культуры, лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта, выдатнікам друку, выдатнікам адукацыі. Аднак нягледзячы на шматлікія рэгаліі і званні, тыя, каму ў свой час пашчасціла працаваць са Стральцовым, вучыцца ў яго, адзначаюць лёгкі характар і сціплы нораў прафесара.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Байдэн растлумачыў рэкорднае падзенне сваіх рэйтынгаў

**Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн пракаментаваў рэкорднае падзенне сваіх рэйтынгаў. Ён заявіў, што не звяртае ўвагу на вынікі апытанняў і не мае патрэбы ў сацыяльным адабрэнні, паведамляе РІА «Навіны».**

Байдэн растлумачыў, што рэйтынгі могуць як падаць, так і расці. Паводле яго слоў, спачатку яны паказвалі больш высокія вынікі, затым абваліліся да сярэдзіны і зноў падняліся, потым апусціліся.

«З усімі іншымі прэзідэнтамі гэта здаралася, але я не таму абіраўся, не для таго, каб вызначаць, як я працую, па асобных апытаннях. Я абіраўся, каб быць упэўненым, што змагу выканаць у якасці прэзідэнта ЗША тое, што абяцаў», — падкрэсліў амерыканскі лідар.

Раней стала вядома, што адабрэнне дзейнасці Байдэна рэкордна ўпала. Папулярнасць палітыка за дзевяць месяцаў яго знаходжання на пасадзе знізілася мацней, чым рэйтынг любога іншага лідара краіны з часоў Другой сусветнай вайны. Так, прэзідэнцкі рэйтынг Байдэна знізіўся на 11,3 працэнтных пункта — з 56 працэнтаў да 44,7 працэнта.

## «Вакцына» стала словам 2021 года

**Vax («вакцына», «вакцынаваць») стала словам 2021 года — яго часцей за ўсё выкарыстоўвалі англамоўныя людзі. Пра гэта паведамляецца на сайце Оксфардскага слоўніка.**




На думку складальнікаў слоўніка, «ніводнае слова не адлюстроўвае атмасферу года лепш, чым «vax». Корань vax спарадзіў мноства вытворных формаў, якія часта выкарыстоўваюцца як у фармальных, так і ў нефармальных кантэкстах: на сайтах прэпаратаў і ў сертыфікатах. Акрамя таго, гэты корань стаў часткай велізарнага запасу выразаў: напрыклад, «атрымаць вакцыну» (getting vaxxed).

Летась Оксфардскі слоўнік не змог выбраць адно слова, якое адлюстроўвае настрой адыходзячага года, — замест гэтага складальнікі назвалі 16 самых папулярных слоў і словазлучэнняў. Сярод выбраных паняццяў у тым ліку тыя, што датычацца эпідэміялагічнай сітуацыі ў свеце: «каранавірус», «каранцін» і «сацыяльная дыстанцыя».

## У Польшчы правялі апытанне аб будучыні ЕС і «Злучаных Штатах Еўропы»

**Пакуль Варшава з Брусселем спрабуюць уладзіць назапашаныя рознагалоссі, простыя жыхары Польшчы выказваюць сваё меркаванне аб будучыні ЕС.**

Па даных партала wPolityce.pl, большая частка насельніцтва краіны хацела б бачыць ЕС як аб'яднанне суверэнных дзяржаў, а не як адзіную звышдзяржаву.

67% рэспандэнтаў указалі, што на дадзены момант у ЕС не варта праводзіць больш глыбокія інтэграцыйныя працэсы. Пераўтварыць аб'яднанне ў «Злучаныя Штаты Еўропы», на іх думку, не трэба; толькі 11 % апытаных хацелі б якраз паглыбленай інтэграцыі і пераўтварэння ЕС у нешта накшталт «адзінай звышдзяржавы».

Пры гэтым галасы за інтэграцыю, пішуць на wPolityce.pl, аддавала ў асноўным моладзь з буйных гарадоў.

«Мы неад'емная частка Еўрасаюза, саюза, які павінен адхіляць мову шантажу, ціску і пакарання тых, хто мае ўласную думку», — указваў у артыкуле для Die Welt польскі прэм'ер Матэвуш Маравецкі. Таксама палітык для Financial Times заявіў наступнае: калі ў Еўракамісіі захочуць пачаць «трэцюю сусветную вайну», то Польшча гатова абараняць свае правы з выкарыстаннем «любых сродкаў».

Адкрыты форум

# РЭЙДЫ, ЛІСТЫ, АПАВЯШЧАЛЬНІКІ

## Пад асаблівай увагай мясцовай улады цяпер — пажарная бяспека старых, адзінокіх, праблемных жыхароў вёсак

**З наступленнем халадоў традыцыйна пагаршаецца пажарная статыстыка, і пытанні бяспекі настойліва «просяцца» на парадак дня. У сельсаветах у пачатку восені актывізуюцца наглядныя камісіі, ладзяцца рэйды зацікаўленых службаў у домаўладанні ўразлівых і праблемных катэгорый грамадзян. Асаблівая ўвага аддаецца адзінокім вяскоўцам і тым, хто з пажылых пражывае адзінока. Пра гэта і не толькі — наша сённяшняя гаворка з кіраўнікамі мясцовай улады.**

**Мікалай ЛІЧЭЎСКІ, старшыня Гараднянскага сельскага Савета Столінскага раёна:**

— Такая праблема бярэ пачатак з дэмаграфічнай сітуацыі вёсак. Цяпер большую частку насельніцтва сельсавета складаюць пенсіянеры. Уявіце сабе, што яшчэ 30 гадоў таму на нашай тэрыторыі былі чатыры пачатковыя школы і адна сярэдняя з колькасцю вучняў пад тысячу. Сёння ў нашай сярэдняй школе займаецца 36 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1970—1980-я гады, калі будаваліся заводы, развівалі ўсе галіны прамысловасці ў гарадах, моладзь спрэс выязджала. А цяпер бацькам тых школьнікаў недзе каля 80 гадоў, многім і таго больш. Дзеці некаторых жывуць ва Украіне, у Расіі, а цяпер, у сувязі з абмежаваннямі ў зносінах, на малой радзіме бываюць рэдка, таму даводзіцца асаблівую ўвагу ўдзяляць пажылым жыхарам.

Пішам пісьмы, нагадваем, калі хто забываецца падправіць печ, замяніць праводку, уцяпліць жытло. Сёлета такіх пісьмаў было адпраўлена дзевяць. Варта сказаць, што нярэдка падобныя напаміны аказваюцца дзейсным інструментам. Адзін гараджанін, атрымаўшы пісьмо, вельмі хутка прыехаў да маці, адрамантаваў праводку, ды яшчэ прасіў прабачэння, што не зрабіў тое раней. Сын пенсіянеркі аказаўся электрыкам. Але здараецца, на жаль, і так, што пісьмы застаюцца без адказу і рэагавання.

Ёсць яшчэ адна праблема, — працягвае Мікалай Васілевіч, — на якую мы звяртаем увагу на сельскіх сходах, на розных нарадах. Гарадскія дзеці, калі праводзяць мадэрнізацыю ў кватэрах, старыя халадзільнікі, тэлевізары, мікрахвалёўкі, пральныя машыны часцяком вязуць у вёску бацькам. А ў тых праводка старая, пракладзеная ў 1960—1970-я гады, яна не заўсёды адпавядае патрабаванням бяспекі і не разлічана на некалькі прыбораў. На гэтыя факты асаблівую ўвагу звяртаюць супрацоўнікі МНС, якія абавязкова бяруць удзел у нашых рэйдах. У Гарадной ёсць свой пажарна-выратавальны пост, яго супрацоўнікі пастаянна трымаюць на кантролі праблемныя домаўладанні. Сёлета за кошт бюджэту пастаўлена 19 пажарных апавяшчальнікаў у дамах адзінокіх састарэлых пенсіянераў. У 25 апавяшчальніках замянілі элементы сілкавання.

**Уладзімір ПЛЕСКАЦЭВІЧ, старшыня Ганчароўскага сельскага Савета Ляхавіцкага раёна:**

— Заўсёды кажу, што лягчэй працаваць у вялікіх населеных пунктах, дзе шмат людзей, а не процьма пустых дамоў. У нашых 26 вёсках пражывае каля паўтары тысячы чалавек, ёсць такія вёсачкі, дзе засталася жменька людзей. Іх бяспека і выклікае найбольшую асцярогу, вымагае ўдзяляць асаблівую ўвагу гэтым населеным пунктам.

Два разы на месяц, па чацвяргах, мы з аглядпай камісіяй, у склад якой звычайна ўваходзяць супрацоўнік МНС, медык, нярэдка прадстаўнік сацыяльнай службы, выязджаем у вёску, наведваем усіх яе жыхароў. На першы план, вядома, выступае гутарка, якой так чакаюць пажылыя людзі — цікавімся іх справамі, патрэбамі, медыцынскі работнік вымярае ціск, робіць агляд. Спецыялісты правяраюць стан праводкі і пячнога ацяплення. Бывае, справа даходзіць да прадпісання, далейшага кантролю, але найчасцей абмяжоўваемся вуснай формай, указаннем на неабходныя меры, якія трэба прыняць. Хачу сказаць, што ў большасці сваёй нашы людзі дысцыплінаваныя, недахопы выпраўляюць — у гэтым ім дапамагаюць дзеці і іншыя сваякі.

Ёсць яшчэ адна катэгорыя грамадзян, якія патрабуюць увагі. Апошнія зусім не пенсіянеры, але лад жыцця іх вымушае жадаць лепшага. І ў гэтым выпадку, як толькі аслабіш кантроль, яны гэта заўважаюць і паводзяць сябе адпаведным чынам. Да такіх стараемся зазірнуць кожны раз, як толькі збіраецца камісія. Асаблівa, калі ў сям'і ёсць дзеці, сям'ю трымаем у полі зроку.

**Валерый ЛУСЕВІЧ, старшыня Рэдзігераўскага сельскага Савета Лунінецкага раёна:**

— Работа ў гэтым кірунку абумоўлена спецыфікай адміністрацыйнай адзінкі. Наш сельсавет — самы малы ў раёне. У чатырох населеных пунктах пражывае крыху больш за тысячу чалавек. Ад самай аддаленай вёскі да цэнтра сельсавета — усяго два з паловай кіламетры. Такім чынам, усё навідавоку. Мы размаўляем з вамі а палове на адзінаццатую, а я ўжо дзве вёскі аб'ехаў. Бываю тут не толькі з аглядпай камісіяй, а практычна штодзённа, размаўляем са старастамі, з жыхарамі. Варта сказаць, што ў нас жывуць вельмі працавітыя, адказныя людзі. Няма такога, каб нейкія абібокі зранку каля магазіна стаялі. Усе занятыя на рабоце альбо сямейнымі справамі. Якраз на чатыры вёскі прыпадае тэрыторыя гаспадаркі «Рэдзігерава-Агра», большасць працаздольных жыхароў працуе там. Ну, а ўсе пытанні бяспекі вырашаем у рабочым парадку. Ёсць у нас, як і ўсюды, аглядная камісія, якая робіць рэйды па графіку, да гэтай работы прыцягваем і мясцовых дэпутатаў. У нас не бывае так, што нейкая праблема ў канкрэтным домаўладанні вырашаецца доўга, кантроль адкладаецца ад выезду да выезду камісіі. Калі ёсць праблема, вызначаецца тэрмін вырашэння і ажыццяўляецца праверка.

На тэрыторыі сельсавета сёння пражывае дзевяць адзінокіх грамадзян. Да іх домаўладанняў асаблівая ўвага. Сёлета адну жанчыну накіравалі на сацыяльны ложак. Бо стала відавочна, што зімаваць у сваёй хаце ёй будзе даволі складана. Астатніх рэгулярна наведваем, аказваем дапамогу па меры магчымасці і патрэбы. Асноўную работу з гэтымі жыхарамі праводзяць сацыяльныя работнікі.

**Святлана МУХА, старшыня Любашаўскага сельскага Савета Ганцавіцкага раёна:**

— У нашым прыгарадным сельсавеце большасць жыхароў працаздольнага ўзросту. Толькі адна вёска Боркі з насельніцтвам 130 чалавек мае большую палову жыхароў-пенсіянераў. Гэтаму населенаму пункту ўдзяляем найбольшую ўвагу ў ходзе работы аглядных камісій і разавых наведванняў. Бяспеку домаўладанняў мы разглядалі сёлета на пасяджэнні прэзідыума і сесіі сельскага Савета яшчэ да пачатку ацяпляльнага сезона. Асноўныя выезды камісіі праводзілі летам, цяпер з улікам эпідэмічнай сітуацыі стараемся радзей наведваць пажылых людзей. Толькі ў выпадку крайняй неабходнасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Дзе вучаць вырабляць аўтарскія цукеркі

## АБ'ЯДНАННЕ НА КАРЫСЦЬ

Новая навучальная ўстанова створана не з нуля, яна атрымала новы статус, працягваючы найлепшыя традыцыі дзяржаўнага політэхнічнага прафесійнага ліцэя і індустрыяльна-педагагічнага каледжа.

Паводле слоў дырэктара ўстановы адукацыі дэпутата Віцебскага абласнога Савета Руслана ВІНАКУРАВА, у абедзвюх установах рыхтавалі прадстаўнікоў аб адналькавых, або блізкіх прафесій сферы гандлю і паслуг.

Сёння агульная колькасць навучэнцаў перавышае тысячу чалавек. Іх вучаць прыкладна дзвесце выкладчыкаў.

Аптымізацыя дазволіць акумуліраваць і больш прадумана расходаваць бюджэтныя сродкі. А якасць навучання, і без таго высокая, будзе павышацца, адпавядаць патрэбам рынку працы.

У хлопцаў і дзяўчат не адбылося ніякіх пагаршэнняў з-за змены статусу і назвы навучальнай установы. Тут можна атрымаць прафесіі пекара, афіцыянта, бармена, кандытара, кухара, кантралёра-касіра, прадаўца... І нават

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



дзве адначасова. Не кажучы пра тое, што навыкі кухара і кандытара карысна атрымаць для жыцця.

Такія спецыялісты лёгка знаходзяць працу як на радзіме, так і за яе межамі. Трэнд часу — развіццё сферы харчавання. Яго не змяніла нават пандэмія COVID-19 і звязаныя з ёй абмежаванні. У Віцебскі індустрыяльны каледж прыязджаюць вучыцца і жыхары прыгранічных расійскіх рэгіёнаў. Дарэчы, выпускнікі — кандытары, кухары і іншыя маладыя спецыялісты — маюць магчымасць выбіраць для працаўладкавання найбольш аптымальныя варыянты з мноства тых, дзе іх чакаюць.

## ПРАКТЫКА Ў КЛАСЕ

У навучальнай установе ёсць рэсурсны цэнтр з добрай сталовай і стыльнай кавярняй. Там гатуюць і падаюць стравы навучэнцы. Гэта — практычныя заняткі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў, што, дарэчы, становяцца адлюстроўваецца на кошце. А каля крамы на колах у двары каледжа выстройваюцца чэргі па гарачыя піражкі і іншую смакату. Нядаўна адкрылася яшчэ адна крама, там акцэнт зроблены на натуральныя інгрэдыенты.

У каледжы працэс навучання максімальна практыка-арыентаваны, падкрэсліла намеснік дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце Марына УЛАСЕВІЧ.

У кавярню каледжа з задавальненнем ходзяць гараджане і прыезджыя. Адна з цікавінак — гарбата тут падаграваецца ў чайніку свечкай. Дызайн і мэбля прадуманы і зроблены рукамі выкладчыкаў і навучэнцаў. Для абслугоўвання заказалі адмысловае праграмнае забеспячэнне: юныя афіцыянты падыходзяць да столікаў з планшэтамі. Штучны інтэлект кантралюе, колькі і чаго заказалі, якая страва самая папулярная, ці ёсць дэфіцыт, ці хапае вытворчых інгрэдыентаў.

У кавярні і на кухні адпрацоўваюць тэарэтычныя веды на практыцы навучэнцы каля дзесяці навучальных устаноў вобласці. Вопытам дзеляцца метадам «роўны роўнаму».

## ВАЗОК — НЕ ПЕРАШКОДА

Аўтара гэтых радкоў зацікавіла магчымасць навучыцца рабіць цукеркі. Акаказваецца, усе ахвотныя могуць за грошы наведваць майстар-класы. За пару дзён навучаць размаўляць з шакаладам на «ты».

Раней вучылі людзей з інваліднасцю кулінарыць, цяпер яны могуць тут атрымаць прафесію. Адзін з рэалізатараў праекта — Віцебская аб'яднаная арганізацыя Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў.

Урокі пачаліся ў канцы лета. Працягласць навучання — менш чым палова года. На заняткі і дадому, калі трэба, могуць прывозіць на спецыяльным транспарце. Гэта было прадумана падчас падрыхтоўкі праекта, які ажыццяўляецца пры фінансавым удзеле адной з нямецкіх дабрачынных арганізацый.

У памяшканні для заняткаў ёсць копія месца працы будучага выпускніка ў гандлёвым цэнтры. Сюды прыязджаюць вучыцца не толькі з Віцебшчыны, але і з Міншчыны.

Карэспандэнт пагутарыў з будучымі касірамі. Казалі, што вучыцца вельмі цікава, выкладчыкі да іх ставяцца як да блізкіх.

Напрацаваны вопыт будзе пераймацца ў іншых абласцях Беларусі. Зацікаўленасць выказваюць і буйныя гандлёвыя карпарацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

# ДЫХАЦЬ ПАВЕТРАМ НАПОЎНІЦУ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***«Снежань мінулага года.*** Паўсюль пісалі пра ковід, былі ўжо выпадкі хваробы і смерцяў сярод знаёмых альбо знаёмых знаёмых. Але ж мы ўспрымалі інфармацыю нібы праз кіно: гэта недзе там, але дакладна не з намі. Я, як усе, хадзіла на работу, вечарам спяшалася дадому, бо трэба навараць, накарміць, праверыць урокі, дапамагчы з дамашнім заданнем, намыць-напрасаваць, прыбраць, разабраць канфлікт, калі нечага не падзялілі мае хлопчыкі. Аднаму — 15, другому — восем. Бывала, злавалася, крычала на іх, потым шкадавала, забывала. Мусіць, як усе. А потым зноў: ранак, работа, клопаты.

У адзін з дзён адчула сімптомы вострай рэспіраторнай інфекцыі. Тэмпература, кашаль, насмарк. Крыху спалохалася, калі назаўтра стала моцна ламаць, выкручваць суставы, а тэмпература не збівалася таблеткамі, але ж спадзявалася, што звычайная прастуда, звычайная інфекцыя. У паліклініцы прызначылі лячэнне, адкрылі бальнічны ліст. Праз колькі дзён паведамілі, што тэст на ковід станоўчы, а здымак на флюарографе паказаў двухбаковую пнеўманію. Але прапановы на шпіталізацыю не паступала, а я не настойвала, і гэта была мая памылка. Я згубіла вельмі важныя для лячэння два-тры дні. А калі стала літаральна задыхацца, пазваніла найперш чамусьці сястры...

Яна і па тэлефоне адчула ступень маёй задышкі, закрычала ў слухаўку: «Неадкладна выклікай хуткую!» Потым ужо расказала, што, аказваецца, крычала так, аж калегі з суседніх кабінетаў збегліся. І гэта дапамагло, я сабралася з духам і набрала запаветны 103. Вядома, чаму сама не зрабіла гэта адразу, бо ўжо дрэнна разумела сітуацыю. Калі прыехала брыгада, сатурацыя ў мяне была 76, і везлі мяне ў бальніцу ўжо пад маскай.

***Тэрапеўтычнае аддзяленне.*** Спачатку я была ў тэрапіі. Адтуль мала што памятаю, пастаянна былі нейкія правалы. Памятаю, як стаяла некалькі дактароў, відаць, вырашалі, што рабіць са мной далей. Пачула раптам: «Каліце морфій!» Спужалася, навошта мне морфій? А цяпер і не ведаю, ці гэта было, ці мне там мроілася апавяданне Булгакава. Потым яны сталі гаварыць пра рэанімацыю, а мне зноў страшна. Рэанімацыя стала асацыіравацца з нейкім канцом, з тым месцам, з якога ўжо не вернешся. Усяму віной, мабыць, недахоп кіслароду ў крыві і парушэнні ў мысленні, у магчымасці ацэньваць сітуацыю. Потым нейкая сястрычка здагадалася, што са мной робіцца, прашаптала на вуха: «Не бойцеся, у рэанімацыі вам лепей будзе, там больш увагі могуць удзяліць хворым, бо іх мала». Мне ўжо было ўсё роўна.

***Рэанімацыя.*** Калі прывезлі ў рэанімацыю, стан быў, думаю цяпер, крытычны. Не ведаю, як гэта назваць, можа, увасобленым пеклам? Калі не проста баліць, а паміраеш кожную хвіліну. Мусіць, наогул няма нічога горшага, чым стан, калі не можаш дыхаць. Адзінаццаць дзён і начэй я знаходзілася ў паўсядзячым становішчы, бо лежачы адразу задыхалася. Зараз часта па тэлевізары бачым, як людзі ў асноўным ляжаць на жываце. Не ўсе могуць так, як высвятлілася. Мне даводзілася і спаць седзячы. І вось у гэтым стане хвіліны расцягваюцца ў доўгія гадзіны, не разумееш ні дня, ні ночы, усё зліваецца ў нейкі адзін боль і ўдушша. Кіслародная маска так упіваецца ў твар, што яе хочацца здзерці, але разумееш, што там выратавальны кісларод.

***Урачы, сёстры, санітаркі.*** Гэтым людзям мая падзяка бязмерная, як і захапленне іх уменнем, спагадай, чалавечнасцю. Мяне цярпліва вучылі дыхаць, унушалі, што ў гэтым маё выратаванне. Апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх у маім выпадку не выйсце. І я разумела, што апарат для мяне можа стаць прысудам. На маіх вачах побач паміралі людзі. За мае 11 дзён у палаце памерлі два чалавекі. Я бачыла, як іх спрабавалі ратаваць, як рэанімавалі. Тое, што паказваюць у кіно пра рэанімацыю, — дзіцячыя практыкаванні, насамрэч гэта працэс вельмі цяжкі, страшны, адказны. О, я больш ніколі не буду глядзець у кіно падобныя фрагменты, бо кінематаграфісты ў гэтым нічога не кемяць...



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Здымкі носяць ілюстрацыйны характар.

Калі прыехала мая сястра, сабраліся сваякі, паўстала пытанне аб пераводзе мяне ў Брэст. Але нашы дактары прыйшлі да высновы, што я нетранспартабельная, што не вытрымаю пераезд. І мяне пакінулі. Цяпер я рада гэтаму неймаверна. Нас было тры чалавекі ў палаце інтэнсіўнай тэрапіі, а ў бальніцах абласнога цэнтра паток людзей, канвеер. Там аб'ектыўна мне не змаглі б удзяліць столькі ўвагі, як у нас.

***Маміна пакрывала.*** Цяжка было яшчэ і таму, што амаль увесь час была ў прытомнасці, вельмі мала ў напаўзабыцці. Праз боль малілася, плакала, прасіла Бога ўзяць да ўвагі, што мае дзеці яшчэ малыя, я ім патрэбная. Мая мама памерла 16 гадоў таму, звярталася ў думках да яе, прасіла заступіцца адтуль. І аднойчы яна прыйшла і агарнула мяне нейкім цёплым пяшчотным пакрывалам. Мне стала так добра, спакойна, я думала, што яна мяне забірае... Але пасля таго я пайшла на папраўку.

Цяпер думаю, што гэта было, і не знаходжу адказу. Мабыць, работа маёй падсвядомасці, мозгу выдала такі кульбіт. Я проста адчувала яе прысутнасць. Не ведаю... І што мы ведаем наогул? Некаторыя вучоныя сцвярджаюць, што пра будову Сусвету мы ведаем не больш за 10 працэнтаў.

Цяжка сказаць, што самае горшае ў такой сітуацыі: боль, немач ці немагчымасць пазваніць, пачуць дзяцей, нешта ім добрае сказаць. Страшна было за дзяцей, я цудоўна ўсведамляла, што кожны дзень можа быць апошні, і думала, як жа яны там будуць без мяне. Яны ж такія дамашнія, хоць і хлопчыкі. Нядаўна глядзела перадачу з Юліяй Перасільд, якая вярнулася з космасу. Дык вось яна сказала, што, усведамляючы вялікую ступень рызыкі, напісала пісьмы дочкам на ўсялякі выпадак. А я ж нічога не напісала, не пакінула нават які-небудзь наказ, мацярынскае благаславенне. Не, я павінна была жыць!

Дзіўна, але яны нібы адчувалі. Муж сказаў, што за ўвесь час не бачыў іх такімі паслухмянымі і сцішанымі. У звычайнай сітуацыі яны могуць учыніць вэрхал у хаце, пабіцца, ну, відаць, як усе дзеці іх узросту. А тут ціха і самастойна рабілі ўрокі, абедалі самі, дапамагалі адзін аднаму. Мусіць, самы шчаслівы дзень быў, калі я праз месяц нарэшце прыйшла дадому.

***Бальнічны закрылі,*** але працаваць я не магла і блізка. Першы раз, калі трэба было ісці ў паліклініку, ахапіла дзіўнае адчуванне: я баялася ісці, баялася сустракаць людзей, не хацелася ўбачыць некага знаёмага. Потым ужо прачытала пра розныя наступствы і ўскладненні. Спачатку ўзяла месяц водпуску за свой кошт, думала, неяк выкараскаюся. Але ўскладненні наваліліся з новай сілай, здароўе літаральна пасыпалася на кавалкі. Некалі пад маскай у рэанімацыі злавалася на валасы, якія перашкаджалі, хацелася астрыгчы іх пад нуль. Цяпер яны выпадалі самі. Тры разы давялося яшчэ праходзіць курсы лячэння ў бальніцы. І зноў з удзячнасцю згадваю нашых урачоў, якія дапамагалі прыступка за прыступкай выбірацца з гэтай багны, якая літаральна зацягвала: катастрафічна падаў гемаглабін, адольвалі іншыя праблемы. За гэты час мне пералівалі кроў дзевяць разоў.

Не верце, што добрыя ўрачы ёсць толькі ў сталіцы, абласных клініках — у нашай раённай бальніцы працуюць цудоўныя спецыялісты. Праверана, як той казаў, на сабе. Старалася выконваць усе рэкамендацыі, выпівала гару медыкаментаў, паступова адчула палёгку. Выйшла на работу. І ўсё роўна пастаянна адчувалася слабасць, стамлялася ад любой хатняй работы, нібы шахцёр пасля змены ў забоі. Чакала з нецярпеннем адпачынку.

***У адпачынак паехала дадому,*** у бацькоўскую хату. Узяла сваіх хлопчыкаў, прабыла там ледзь не цэлы месяц. Гэта не метафара, што дома сцены дапамагаюць, гэта праўда. Нідзе і ніколі з пачатку ўсёй хваробы не адчувала такога спакою, як у родным доме. Мой тата, які ўвесь гэты час вельмі перажываў за мяне, падаўся асабліва спагадлівым і ўважлівым. Мы кожны вечар сядзелі ў двары каля кастра, не маглі нагаварыцца. Ён расказваў нейкія гісторыі са сваёй маладосці, з ранейшага жыцця, пра якія ніколі не згадваў раней. А я ўсё не магла надыхацца, хацелася запомніць гэты водар: травы, кветак, дыму кастра — лета, які здаваўся тут асаблівым, прыязным, смачным, калі хочаце, бо гэта і быў водар дому. Вось тут я ўпершыню адчула сябе не тое што цалкам здаровай — адчула ранейшай, якой была да гэтай каварнай хваробы, якая, здаецца, выцягнула ўсе сокі, энергію з душы.

***Цяпер я навучылася радавацца дробязям,*** не звяртаць асаблівай увагі на нейкія побытавыя альбо рабочыя праблемы. Вось раней думала, як сабраць на дарагую пуцёўку, каб паехаць усёй сям'ёй на мора — цяпер разумею, што няма лепшага адпачынку, як у бацькоўскай хаце. Бывала, раздражняла не тая мэбля ў пакоі, якую хацелася б, школьная адзнака сына. Цяпер на ўсё гляджу пад іншым ракурсам. А людзі, якія здараліся, крыўдзілі, здаюцца мне цяпер маленькімі, смешнымі, нехлямяжымі, адным словам, не вартымі вялікай увагі і перажыванняў.

Па-іншаму цяпер адчуваю прыгажосць прыроды, таму магу доўга стаяць і глядзець на жоўтую бярозу альбо, як пісаў Караткевіч, «на рыжы ліст у зелені травы». З асалодай бяру ў рукі любімую кнігу альбо перакладаю ў шуфлядзе мілыя дробязі. Многае бачыцца нібы інакш, як упершыню. Мне хочацца болей быць з дзецьмі, больш камунікаваць са сваякамі, са знаёмымі. Не раз думаю над тым, колькі мы губляем, бо менш сталі сустракацца, менш гаварыць адно з адным. Прападаем у гаджэтах замест звычайнай чалавечай гаворкі хай і па тэлефоне.

А тут яшчэ нядаўна памерла 75-гадовая жанчына, вельмі дарагі мне чалавек. Пасля смерці мамы яна мяне здорава падтрымлівала. Для свайго ўзросту яна была надзвычай энергічнай, вяла здаровы лад жыцця, сачыла за здароўем, але ковід не пашкадаваў. Згарэла літаральна за некалькі дзён. І я падумала, што больш трэба гаварыць аб гэтай праблеме, расказваць, як яно ёсць, каб людзі задумаліся і больш увагі ўдзялілі прафілактыцы. Бо многае насамрэч залежыць ад кожнага. Я праз паўгода зрабіла прышчэпку.

Калі нашы асабліва старэйшыя людзі пакуль не рашаюцца прайсці вакцынацыю, яны павінны да мінімуму звесці стасункі і выхады ў грамадскія месцы. Гэта не грып, не шараговая інфекцыя. За доўгія месяцы роздуму прыйшла да высновы, што гэта навала нібы пасланая нам цёмнымі сіламі, бо нават урачы не могуць зразумець логіку развіцця і цячэння хваробы, як іншых захворванняў. Ну вось, скажам, гляджу на канале «Мір» выступленне інфекцыяніста з Малдовы. Яна аб гэтым гаворыць, бо не можа растлумачыць факт са сваёй бальніцы, калі на працягу аднаго тыдня яны выпісалі 101-гадовую бабулю, што ўпэўнена пайшла на папраўку, і страцілі 16-гадовую дзяўчынку. Беражыце сябе і адзін аднаго, гэта цяпер не банальныя заклікі», — гаворыць Каця.

Тэкст дадзены ад першай асобы, бо ён амаль цалкам складаецца з фрагментаў нашых гутарак з Кацярынай Яцушкевіч з Маларыты. Я спытала, ці варта змяніць прозвішча, яна адказала: «Не трэба, я ж гэта ўсё не прыдумала. А здымкі хай будуць ілюстрацыйнымі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Час лячыць сэрца

### У Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы адноўлена планавая дапамога хворым кардыялагічнага профілю

Рашэнне прынятае па ўзгадненні з галоўным упраўленнем па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама. Больш за тры тыдні кардыяхірургічнае і кардыярэанімацыйнае аддзяленні працавалі як ковідны шпіталь. А профільныя хворыя чакалі, калі стане магчыма прайсці курс лячэння. Паводле слоў **галоўнага ўрача аблбальніцы Аляксандра КАРПІЦКАГА,** зараз назіраецца невялікае зніжэнне тэмпаў росту колькасці пацыентаў з COVID-19 і пнеўманіяй, таму вырашана аднавіць планавую кардыялагічную дапамогу.

За выхадныя дні праведзена апрацоўка аддзяленняў, і з пачатку тыдня кардыяхірургічнае і кардыярэанімацыйнае аддзяленні прыступаюць да работы ў звычайным рэжыме. Будуць праводзіцца планавыя аперацыі.

Мяркуецца, што на гэтым тыдні адновіць работу аддзяленне пульманалогіі, а крыху пазней — таракальнае аддзяленне. Такім чынам, з сямі дадаткова разгорнутых ковідных аддзяленняў у абласной бальніцы застанецца тры.

Акрамя абласной клінічнай бальніцы ў Брэсце дапамогу пацыентам з ковідам аказваюць у Брэсцкай цэнтральнай гарадской бальніцы, гарбальніцы № 1, абласных супрацьтуберкулёзным і скурвендыспансеры. Цяжарных жанчын, парадзіх з інфекцыяй прымае абласны радзільны дом, дзяцей шпіталізуюць у дзіцячую бальніцу.

**Яна СВЕТАВА.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Сморгоньагросервис», ул. Тракторная, 64, 231000, г. Сморгонь** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**
**Мойка** (Здание неустановленного назначения) **общей площадью 250,3 кв. м, инв. номер 443/С-7562.**
Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное нежилое здание (А2/к) с отстойником (о).
**Адрес:** Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Тракторная, 85
**Сведения о земельном участке:**
предоставлен на праве собственности общей площадью 0,7513 га для строительства и обслуживания мойки

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **79 662,53 белорусского рубля** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов – 10.00 **03.12.2021 г.**
Окончание торгов – 11.00 **03.12.2021 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.12.2021 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

**Организатор торгов – антикризисный управляющий ДУП «ПМК-190» УП «Минскоблсельстрой» – общество с ограниченной ответственностью «ПРАВОВОЙ АСПЕКТ» в лице директора Д.А. Боброва,** *действующего на основании определения экономического суда Минской области от 02.12.2019 года № 198-13Б/2019,* **сообщает о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ДУП «ПМК-190» УП «Минскоблсельстрой», состоящего из:**

| | |
|---|---|
| Сведения об организаторе торгов | Общество с ограниченной ответственностью «ПРАВОВОЙ АСПЕКТ» в лице директора Д.А. Боброва (220100, г. Минск, ул. Сурганова, д. 57Б, пом. 113в (4-й этаж), тел. 8044 589 96 89) |
| Продавец | ДУП «ПМК-190» УП «Минскоблсельстрой» (Минская обл., г. Дзержинск, ул. Фрунзе, д. 2, УНП 690019034). Тел. 8044 589 96 89 |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | Торги в форме открытого аукциона на электронной торговой площадке www.torgi.gov.by. **Начало торгов – 15.11.2021 в 09.00. Окончание торгов – 15.11.2021 в 16.00.** Ссылка на аукцион: https://torgi.gov.by/auction/6227/view |
| Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним | Предметом торгов являются транспортные средства, объекты недвижимого имущества и оборудование. Движимое имущество расположено по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фрунзе, д. 2. Недвижимое имущество расположено по адресу: Минская область, г. Узда, ул. К. Маркса, д. 130Е. Ознакомиться с имуществом можно с понедельника по пятницу с 9.00 до 16.00. Со списком имущества и начальной ценой можно ознакомиться на сайте https://bankrot.gov.by |
| Порядок проведения торгов | Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену. Договор купли-продажи подписывается в 5-дневный срок с даты подписания протокола по результатам торгов. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета аукциона претенденту на покупку при его согласии осуществляется по начальной цене, увеличенной на 5 % |
| Сроки и порядок приема заявок и зачисления задатка | Для участия в торгах в срок по 14.11.2021 необходимо подать заявку на участие в торгах; задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется до подачи заявки на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь». Адрес: г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513, тел.: 200-95-63, 200-73-33, 200-64-11 УНП 190318109 ОКПО 37533622 р/с: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ» БИК BELBBY2X |
| Сроки приема заявок на участие в торгах и прилагаемых к ним док-тов | Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления по 14 ноября 2021 года, на сайте торговой площадки согласно инструкции: https://torgi.gov.by/instruction, торги могут быть отмены за 5 дней до их проведения. Победитель торгов до заключения договора купли-продажи возмещает организатору торгов затраты на проведение торгов в соответствии с прейскурантом торговой площадки. Лот выставляется на торги без учета НДС. В дальнейшем победитель торгов приобретает лот и производит его оплату с учетом НДС, который начисляется от максимальной цены продажи лота |

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Строительный трест № 13», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пролетарская, 28** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, бывшие в употреблении, расположенные по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, 5-й км Минского шоссе**

| Лот № | Наименование (рег. знак) | Начальная цена (без НДС) | Минимальная цена (без НДС) |
|---|---|---|---|
| 1 | Автобетоносмеситель КАМАЗ 65115 (рег. знак АА 2766-6) | 9 200,00 | 5 520,00 |
| 2 | Автобетоносмеситель МАЗ 6303 (СМБ-372) (рег. знак ТА7720) | 13 700,00 | 8 220,00 |
| 3 | Автобус «Икарус» 256 (рег. знак АА 8091-6) | 2 800,00 | 1 680,00 |
| 4 | Автобус «Икарус» 256 (рег. знак АВ 1437-6) | 2 800,00 | 1 680,00 |
| 5 | Автобус PAZ 3205 (рег. знак ТА7677) | 1 200,00 | 720,00 |
| 6 | Автокран МАЗ 53372 КС 3579 (рег. знак ТА7156) | 17 200,00 | 10 320,00 |
| 7 | Автокран КС-3577-3 (рег. знак 1706 МГТ) | 1 700,00 | 1 020,00 |
| 8 | Автомобиль ГАЗ 32213 (рег. знак ТІ01119) | 920,00 | 552,00 |
| 9 | Автомобиль GreatWallHover (рег. знак 9730 ВН-6) | 3 400,00 | 2 040,00 |
| 10 | Автомобиль ВАЗ 2107 (рег. знак 8558 АМ-6) | 920,00 | 552,00 |
| 11 | Автомобиль GAZ-330232 (рег. знак АВ 2568-6) | 3 600,00 | 2 160,00 |
| 12 | Автомобиль ГАЗ 3110 (рег. знак 7308 АТ-6) | 780,00 | 468,00 |
| 13 | Автомобиль ГАЗ 32213 (рег. знак АА 2284-6) | 2 100,00 | 1 260,00 |
| 14 | Автомобиль ГАЗ 33023 (рег. знак АА 2285-6) | 2 500,00 | 1 500,00 |
| 15 | Автомобиль GAZ-32213 (рег. знак АА 1006-6) | 2 200,00 | 1 320,00 |
| 16 | Автомобиль ГАЗ 33104 1 (рег. знак АА 2556-6) | 3 800,00 | 2 280,00 |
| 17 | Автомобиль Lada 21703 (рег. знак 2687 ВС-6) | 1 800,00 | 1 080,00 |
| 18 | Автомобиль MAZ 5336 А3 (рег. знак АІ 1643-6) | 5 900,00 | 3 540,00 |
| 19 | Автомобиль MAZ 5432 А3 (рег. знак АВ 2580-6) | 5 200,00 | 3 120,00 |
| 20 | Автомобиль МАЗ 5551 А2 (рег. знак ТА7435) | 4 800,00 | 2 880,00 |
| 21 | Автомобиль МАЗ 5516 А5 (рег. знак ТА7605) | 9 500,00 | 5 700,00 |
| 22 | Автомобиль МАЗ 555102-223 (рег. знак ТС1938) | 6 400,00 | 3 840,00 |
| 23 | Экскаватор JCB JS220SC (рег. знак ТВ-6 9578) | 26 400,00 | 15 840,00 |

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота (по всем лотам)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи: **5 рабочих дней** после электронных торгов. Срок и порядок оплаты лота: в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания торгов:**
**29.11.2021** с 09.00 до 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: 25.11.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ГП «Жилищник Минщины» (арендодатель) проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды:**

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 |
|---|---|---|---|
| Наименование объекта | **Торговое помещение с инв. № 600/D-126371** | **Административное помещение с инв. № 600/D-126448** | **Административное помещение с инв. № 600/D-126447** |
| Адрес объекта | **г. Заславль, м-н Микрорайон, 1, д. 5-52** | **г. Заславль, ул. Механизаторов, 1-1** | **г. Заславль, ул. Механизаторов, 1-5** |
| Общая пл., кв. м | 79,4 | 35,2 | 34,8 |
| Срок заключения договора аренды | 3 года | 3 года | 3 года |
| Начальная цена права заключения договора аренды | 335,47 бел. руб. | 148,72 бел. руб. | 147,03 бел. руб. |
| Сумма задатка | 33,55 бел. руб. | 14,87 бел. руб. | 14,70 бел. руб. |
| Размер ежемесячной арендной платы | 59,55 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) | 26,40 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) | 26,10 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) |
| Коэффициент месторасположения – 1; коэффициент спроса – 3; коэффициент для отдельных видов деятельности (при наличии оснований) | | | |
| Целевое использование имущества | Для размещения магазина, производства продукции, выполнения работ и оказания услуг (при наличии возможностей в зависимости от видов деятельности); размещения органов управления, складского хранения | | |
| Условия | Установить приборы учета потребления электроэнергии, теплоэнергии, водопотребления; обеспечить своими силами оснащение арендованного Имущества средствами противопожарной защиты; восстановить за свой счет систему отопления. В течение 1 (одного) месяца с момента подписания договора аренды произвести установку электрического счетчика в арендуемом помещении без последующего возмещения Арендодателем понесенных Арендатором затрат. В течение 5 рабочих дней с момента постановки на учет прибора учета электроэнергии в РУП «Минскэнерго» филиал «Энергосбыт» Арендатор обязан заключить договор на электроснабжение с Арендодателем. Расходы Арендодателя по содержанию, эксплуатации, капитальному и текущему ремонту сданного в аренду Имущества (при их наличии) и другие услуги не включаются в арендную плату и возмещаются Арендатором отдельно. При производстве работ по текущему ремонту общих частей здания, инженерного оборудования, элементов благоустройства оплата Арендатором производится пропорционально доле площади арендуемого недвижимого Имущества в общей доле недвижимого имущества без учета площади мест общего пользования. Отчисления на капитальный ремонт вносятся Арендатором ежемесячно согласно арендуемой площади недвижимого Имущества по тарифам, установленным в соответствии с законодательными актами | | |

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В настоящее время базовая арендная величина составляет 16,90 бел. руб. т. к. веден мораторий на увеличение базовой арендной величины по 31 марта 2022 года. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

**Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение), а также иными актами законодательства.

Штраф в размере **2 900,00 бел. руб.** оплачивается участниками аукциона в следующих случаях:

- победителем (единственным участником) аукциона в случае отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора аренды, внесения платы за право заключения договора аренды;
- участниками аукциона, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным в соответствии с частью второй пункта 26 Положения;
- победителем в случае отказа от подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится **08.12.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.12.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Телефон для осмотра 017 510 08 53 сайт в сети интернет: www.rlt.by.**

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах: **au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by**

УНП 691536750

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**
**«БелЮрОбеспечение»** (192821149)
**назначено проведение электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| Организатор | Туристско-экскурсионное дочернее унитарное предприятие «Гроднотурист» |
| Предмет | Лот № 9.2021.11.00020. Автомобиль ГАЗ-31105, 2005 г. в. |
| Место нахождения | г. Гродно, пр-т Янки Купалы, 63 |
| Начальная стоимость | 1 900,00 белорусских рублей без НДС |

**Торги будут проведены 23.11.2021 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 22.11.2021.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

УНП 192821149

Утерянные представительством Белгосстраха по Солигорскому району квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии ВА №№ 2878826-2878828 в количестве 3 шт. **считать недействительными.**

УНН 100122726

Энергетыка

# МЯСЦОВАЯ, АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ, АТАМНАЯ...

## Баланс ядзернай, тарфяной і смеццевай энергіі для цяпла і эканоміі

**Беларусь сёлета стала ядзернай дзяржавай. Цяпер электраэнергія, якую атрымліваюць ад ядзернага паліва, выкарыстоўваецца для шматлікіх патрэб, у тым ліку для награвання вады, ацяплення і гатавання ежы. Аднак акрамя атамнай станцыі ў айчыннай энергасістэме сёння працуе магутны ветрапарк, разглядаюцца пытанні адраджэння гідраэнергетыкі, развіцця сонечнай энергетыкі. Перспектыўны напрамак таксама — атрыманне энергіі ад цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). Пры гэтым нельга дапусціць канфлікт інтарэсаў ці канкурэнцыю паміж рознымі відамі энергарэсурсаў, у тым ліку мясцовымі, упэўненыя эксперты Міністэрства энергетыкі. Яны расказалі пра пошук балансу паміж крыніцамі энергіі і новую прадукцыю, якую атрымліваюць з класічнага паліва.**

### Торф з пілавіннем і лігнінам, «сушонка», пажыўныя грунты

Перыяд «стаяння нізкіх тэмператур» (гэта тэрмін цеплатэхнікаў) у Беларусі становіцца ўсё больш кароткім, як і працягласць ацяпляльнага сезона, лічаць энергетыкі. Таму людзі павінны мець выбар, чым саграваць: дровамі, торфам, газам ці электрычнасцю.

Торф быў і застаецца мясцовым паліўным рэсурсам, які штогод здабываецца ў краіне і актыўна выкарыстоўваецца для выпрацоўкі энергіі. Да 1970-х ён быў незаменным энергарэсурсам і ў вялікай энергетыцы, дзе яго цяпер менш, аднак працягваюць ужываць. Прывабным ён застаецца і для бытавога сектара. Сыравінная тарфяная база дазволіць забяспечыць патрэбы краіны на найбліжэйшае стагоддзе, расказала **Вольга ПРУДНІКАВА, намеснік міністра энергетыкі:**

— Пасля 1970-х беларусы перайшлі на больш высокакаларыйнае паліва — мазут. У пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя энергакрыніцы актыўна пераводзіліся на спальванне прыроднага газу, адзіным пастаўшчыком якога была Расія. З уводам АЭС комплексным пытаннем стала як збалансаванае развіццё ўсіх відаў энергакрыніц, так і збалансаванасць самога балансу.

Запасаў торфу ў Беларусі хопіць яшчэ на 100 гадоў, і ў краіне працуюць над стварэннем новых відаў паліва на аснове торфу з дабаўленнем пілавіння і лігніну (складнік драўніны).

Шмат прадукцыі выпускаецца прадпрыемствамі і цяпер. Больш за 60 відаў пажыўных грунтоў з верхавога торфу выпрацоўваюць на торфабрыкетным заводзе «Віцебскі». На іх прадукцыі гадуецца айчынная лясная гаспадарка. Восем тысяч тон грунтоў ужываецца ўнутры краіны, а 40 тысяч — ідзе на экспарт. Унікальная прадукцыя завода — рачны торф (натуральны некрануты залеж торфу), які проста наразаецца з радовішча і сушыцца на працягу года.

Каб актываваць карысныя рэчывы ў торфе, на торфабрыкетным заводзе «Усяж» (Смалявіцкі раён) асвойваюць вытворчасць сухіх папер. Гэты прадукт можна выкарыстоўваць у раслінаводстве і нават карміць ім жывёлу. А тарфяны попел, у які дадаюць нізінны торф, ужываюць для вытворчасці тарфазольнага меліяранту грунтоў. Яго выкарыстоўваюць для рэкультывацыі ці падсыпкі дарог, вырошчваць расліны на ім нельга.

### Пара, попел і брыкет

Адно з тарфяных айчынных прадпрыемстваў — торфабрыкетны завод «Дзітва», дзе здабыча торфу пачалася ў 1972-м, а ў 1975 годзе — запушчана вытворчасць торфабрыкетаў. Цяпер у прадпрыемства 980 гектараў зямлі для работы, з якіх непасрэдна палёў здабычы карысных выкапняў — 480 гектараў. Штогод са здабытага торфу тут выпрацоўваюць 110 тысяч тон прадукцыі. 77 % з іх — торфабрыкет, які пастаўляюць у Гродзенскую і Віцебскую вобласці, а таксама на экспарт за мяжу, у асноўным Літву. З 2016 года займаюцца пастаўкай тарфяной «сушонкі» (13 %) для цэментных прадпрыемстваў, у прыватнасці, для завода «Красносельскбудматэрыялы». Ствараюць таксама пажыўныя грунты, гумус і вугаль для барбекю.

— Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя зніжэння ўжывання торфу насельніцтвам, бо ў вёсках натуральна памяншаецца колькасць жыхароў. Аднак павялічваецца яго прамысловае спажыванне. Крыху прадаём прадукцыі ў Віцебскую вобласць і для прадпрыемстваў ЖКГ, — падзяліўся **Казімір БАНЦЭВІЧ, дырэктар торфабрыкетнага завода «Дзітва».** — У нас забяспечанасць палямі добрая — 130 % ад патрэбы, таму ёсць дзе здабываць торф. Сёлета за два месяцы (чэрвень, ліпень) здабылі аб'ём, дастатковы для паўнавартаснай работы на каляндарны год. У маі з-за неспрыяльнага надвор'я мы торф не здабывалі.

Два паравыя катлы ў кацельнай Дзітвы, якія забяспечваюць вытворчасць тэхналагічнай пары, пераведзены на торф у 2014 і 2016 гадах. Магутнасць кожнага з іх — 10 тон пары ў гадзіну, а працэс спальвання торфу цалкам механізаваны. На маніторах відаць работу катлоў і можна сачыць за падачай торфу, паказаў сваю гаспадарку дырэктар.

— Вунь з вагонаў разгружаецца торф, што прыходзіць з балота. Ён па канвееры паступае ў падрыхтоўчае аддзяленне, дзе з яго магнітам выдаляецца метал. Пасля з торфу выбіраюцца камяні. На млыне ён драбніцца, а на сепаратары з торфу выкідаецца лішняе. Затым торф падымаецца на трэці паверх у паравую сушылку, дзе з яго выпараецца вільгаць і ён высушваецца. Каб збрыкетаваць торф, яго вільготнасць павінна быць 16-18 %, а прыходзіць ён з 40-42-працэнтнай вільготнасцю.

Паколькі прадпрыемства пажаранебяспечнае, два разы на суткі тут робіцца генеральная вільготная прыборка. Паравая турбіна здольная выпрацоўваць 600 кВт энергіі, аднак яе асноўная работа надыходзіць з пачаткам ацяпляльнага сезона. Двума рэзервовымі катламі, што працуюць на газе, тут, дарэчы, не карыстаюцца ўжо пяць гадоў.

З попелу, які застаецца пасля спальвання торфу, робяць гравійна-попельную сумесь для падсыпкі асновы дарог. Ёсць і свая лабараторыя даследавання торфу па розных характарыстыках. А каб адпавядаць экалагічным патрабаванням, сёлета на заводзе знмадэрнізавалі абсталяванне па сістэме аспірацыі — абяспыльвання, каб у паветра траплялі толькі чыстыя выкіды.

### Патэнцыял адходаў і атамная генерацыя

Больш актыўна, на думку энергетыкаў, трэба ўцягваць у паліўны баланс краіны і цвёрдыя камунальныя адходы. А ядзерная энергетыка — гэта не толькі спосаб забяспечыць прадпрыемствы таннай электраэнергіяй, але і магчымасць паменшыць шкодныя выкіды ў атмасферу. Усё часцей яна становіцца асновай стабільнасці энергетычных рынкаў, мяркуюць спецыялісты.

— Ужо спрабавалі выкарыстоўваць смецце на аб'ектах Мінэнерга, аднак пакуль прыйшлі да высновы, што больш перспектыўна сёння ўжываць ЦКА ў рэгіёнах, дзе іх можна спальваць у сумесі са шчапой ці торфам, — мяркуе Вольга Пруднікава. — Такім чынам будзе вырашацца пытанне не толькі энергетычнай, але і экалагічнай бяспекі краіны. А павелічэнне электраспажывання — не проста трэнд, каб траціць электрагадзіны, а паказчык стану нашай эканомікі. Удзельнае спажыванне энергарэсурсаў насельніцтвам Беларусі мае даволі сярэдні паказчык сярод найбліжэйшых суседзяў. Эканоміка будзе расці — будзе расці электра- і цеплаunion спажыванне, адпаведна, будзе дыверсіфікавацца баланс, і ў яго будуць уцягвацца мясцовыя віды ПЭР.

Выкарыстанне атамнай генерацыі дазволіць зрабіць энергетычную галіну больш экалагічнай, упэўненая **Надзея ЗДАНЕВІЧ, начальнік упраўлення тэхнічнага суправаджэння «Белэнерга»:**

— Памяншэнне выкарыстання арганічнага паліва з уводам у эксплуатацыю атамнай электрастанцыі ў Беларусі прывядзе да зніжэння выкідаў парніковых газаў у атмасферу больш чым на сем мільёнаў тон на год. А ўсе працуючыя ў свеце АЭС прадухіляюць выкід двух мільярдаў тон вуглякіслага газу.

Энергетыкі сцвярджаюць, што нізкая доля паліўнага складніка ў кошце атамнай генерацыі (10-15 %) дазваляе спажыўцу прагназаваць цэны на ўвесь жыццёвы цыкл, які складае практычна 100 гадоў. А гэта вельмі важна і для прамысловага сектара, і для прыватнага спажыўца. Увогуле, атамная энергетыка — гэта інфраструктурны драйвер краіны: развіццё навукі, ядзернай медыцыны, новых тэхналогій для сельскай гаспадаркі.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**












Такую разнастайную прадукцыю робяць з торфу: ад брыкетаў і пелетаў да грунтоў і ўгнаенняў.

## Развівацца на аснове ўласнага невычэрпнага рэсурсу

### Бізнес-ідэі, заснаваныя на прыродных багаццях, садзейнічаюць паскоранаму развіццю рэгіёнаў

**У Беларусі нядаўна прайшоў дзень адкрытых дзвярэй беларускіх аграэкасядзіб. Турысты атрымалі магчымасць наведаць каларытныя падворкі ў розных раёнах краіны і азнаёміцца з шырокім спектрам паслуг, якія там аказваюцца.**



«Мы назіраем адназначна пазітыўныя тэндэнцыі ў галіне, — лічыць **намеснік міністра эканомікі Анжаліка НІКІЦІНА.** — Расце попыт на паслугі аграсядзіб, і ў выніку маем станоўчы ўклад у эканоміку. Па выніках паўгоддзя — значны прыток інвестыцый у сферу адпачынку: у два разы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года».

Як адзначыла намеснік міністра, індустрыя ўнутранага турызму ў цяперашніх умовах мае вялікія рэзервы для развіцця. Яе доўгатэрміновыя перспектывы прааналізаваны ў падрыхтаваным Нацыянальным агенцтвам інвестыцый і прыватызацыі тызеры агляду турыстычнага сектара Беларусі, дзе, па сутнасці, упершыню вылучаны дзеючыя і патэнцыяльныя кластары на аснове выяўленых рэкрэацыйных рэсурсаў, існуючай інфраструктуры і інвестыцыйных патрэб.

«Дарэчы, эксперты агенцтва BIK Ratings склалі топ-10 перспектыўных інвестпраектаў з базы агенцтва. У рэйтынг трапіла прапанова па рэканструкцыі турыстычнай базы на беразе возера Рудакова. Гэта месца знаходзіцца ў сэрцы турызму Беларусі — Нарачанскім краі, лакацыя стабільна прываблівае людзей, ёсць падрыхтаваныя кадры, — перакананая Анжаліка Нікіціна. — А значыць, у руках вопытнага і адказнага інвестара праект хутка акупіцца. Такія бізнес-ідэі садзейнічаюць паскоранаму развіццю тэрыторый на аснове ўласнага невычэрпнага рэсурсу — іх прыродных багаццяў».

## Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ:

# «БАЛЕТ НЕМАГЧЫМА СТВАРАЦЬ З ХАЛОДНЫМ СЭРЦАМ»

**Дзякуючы Валянціну Елізар'еву беларускі балет стаў адным з найлепшых у Савецкім Саюзе, а потым здабыў і сусветную вядомасць. Красамоўнае сведчанне гэтаму — прысуджэнне Елізар'еву ў 1996 годзе прэміі Міжнароднай асацыяцыі дзеячаў харэаграфіі «Бенуа дэ ля данс» як найлепшаму харэографу свету (за пастаноўку балета «Страсці» Мдзівані).**

Творчасць знакамітага харэографа сучаснасці па заслугах ацэнена і на дзяржаўным узроўні. Валянцін Елізар'еў — кавалер ордэна Францыска Скарыны, ордэна Дружбы народаў, ордэна Айчыны другой і трэцяй ступені. Ён — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і прэміі Саюзнай дзяржавы.

Але ёсць і адваротны бок неверагоднай папулярнасці Елізар'ева-харэографа. Зайздрасць. Нядобразычлівасць. Скептыцызм. На жаль, усе гэтыя крыватолкі прывялі аднойчы да неверагоднага: знакамітага харэографа на цэлых дзевяць гадоў адлучылі ад роднага тэатра. Ад тэатра, але не ад любімага балета.

У рэшце рэшт справядлівасць перамагла. І восенню 2017 года Елізар'еў трыумфальна вярнуўся ў Вялікі тэатр. Трыумфальна, бо за няпоўныя два гады паставіў у новай рэдакцыі пяць сваіх шэдэўральных спектакляў. А на нядаўняй Нацыянальнай тэатральнай прэміі атрымаў яшчэ адну ўзнагароду — «За шматгадовае служэнне сцэне».

## Балет — мастацтва думкі

***— Валянцін Мікалаевіч, вы неяк выказалі даволі парадаксальнае меркаванне пра тое, што балет — гэта мастацтва думкі.***

— А ў чым парадокс?

***— Ну, хоць бы ў тым, што гэта мастацтва без слоў.***

— Вы ведаеце, балет, напэўна, тым і цудоўны, што ён можа адным ці некалькімі жэстамі перадаць думку, на якую словамі спатрэбілася б цэлая старонка. Магу назваць толькі адну ўмову-абмежаванне: балет немагчыма ствараць з халодным сэрцам.

***— Іншымі словамі — не быць рамеснікам.***

— Вы ведаеце, я да гэтага вызначэння стаўлюся вельмі паважліва. Калі гэта рамеснік высокага ўзроўню. У балеце, асабліва ў выканаўцаў, поспех на пяцьдзясят працэнтаў залежыць ад прыроды і на пяцьдзясят працэнтаў — ад адукацыі. Рамяство павінна быць атрымана з вельмі добрых педагагічных рук. Сапраўдны педагог не ламае чалавечае цела, а як бы фарміруе яго наноў, адточвае, удасканальвае яго пластыку.

***— Вы згадалі важнасць добрай педагагічнай школы. Ці склалася такая школа ў нас у краіне?***

— Так, яшчэ ў даўнія часы сюды, на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага, запрашаліся найлепшыя французскія, італьянскія педагогі, якія працавалі з мясцовымі балетнымі школамі. А ў XVIII стагоддзі такіх школ было нямала. Дастат-



sputnik.ru

кова назваць Гродзенскі тэатр Тызенгаўза, Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, Слонімскі тэатр Агінскага, Ружанскі тэатр Сапегаў, Слуцкую і Шклоўскую балетныя трупы і іншыя.

Найлепшыя вучні з гэтых школ былі адабраны рускім балетам у Маскве, Санкт-Пецярбургу, а таксама ў Варшаве. Так, напрыклад, прыгонная балетная трупа са Шклова прыдворнага тэатра Сямёна Зорыча была перададзена дырэкцыі Санкт-Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў і вывезена ў сталіцу Расійскай імперыі. А «Таварыства танцоўшчыкаў Яго Каралеўскай Вялікасці» ў Варшаве сфарміравана з выпускнікоў балетных школ Гродна і Слоніма. Шмат таленавітых беларускіх танцоўшчыкаў было перададзена Міхалам Казімірам Агінскім польскаму каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму ў вечнае валоданне.

У выніку такога шчодрага донарства ў беларускім балеце, росквіт якога прыпадае на XVIII стагоддзе, у наступныя гады нічога значнага не адбывалася. Усё было сканцэнтравана ў трох сталіцах — Маскве, Санкт-Пецярбургу, Варшаве.

Новы ўздым у развіцці беларускага балета намеціўся ў пачатку дваццатых гадоў мінулага стагоддзя. Менавіта тады пры Першым беларускім дзяржаўным тэатры была сфарміравана прафесійная балетная трупа. Занняткі будаваліся на аснове методыкі выдатнага рускага педагога Агрыпіны Ваганавай. Такім чынам, у XX стагоддзі сапраўдная методыка класічнага балета ў Беларусь прыйшла ўжо не з Захаду, а з Расіі.

Бурнае развіццё беларуская харэаграфія атрымала пасля Вялікай Айчыннай вайны. Многае адбывалася ўжо і на маіх вачах. Прыняўшы творчую эстафету ад маіх папярэднікаў — Канстанціна Алексютовіча, Канстанціна Мулера, Атара Дадышкіліяні, я паставіў перад сабой задачу не толькі не ўпусціць высока паднятую планку, але і па магчымасці падняць яе яшчэ вышэй.

***— Кажуць, рэжысёру-пастаноўшчыку неабходна быць у нейкім сэнсе дыктатарам. А як складваюцца адносіны з калектывам у вас?***

— Дыктатура павінна быць, але дыктатура таленту. Два гады таму я прыняў, як бы гэта сказаць мякчэй, няправільна сфарміраваныя трупы. Вось зараз я спрабую навесці там парадак. Даць дарогу маладым, таленавітым кадрам. Гэта — вялікая і складаная работа.

Ніхто не зацікаўлены рабіць беларускі рэпертуар, акрамя нас саміх. Хачу, каб у нас была свая школа і рэжысёрская, і харэаграфічная, таму так многа зараз уводжу моладзі.

Якія ў мяне адносіны ў калектыве? Самыя паважлівыя. Асабліва да дзяўчат, жанчын. Ніколі ў сваім жыцці я не дазволіў сабе сказаць грубае, дрэннае слова ў адрас артыстаў. Магу сказаць крыўдную праўду аб рабоце. Але абавязкова ў мяккай, інтэлігентнай форме. І то стараюся рабіць гэта сам-насам. А вось хвалю заўсёды публічна. Бо ў творчых людзей павышаная ранімасць. Таму, нягледзячы ні на што, крыўды часам бываюць. Але мы іх пераадольваем у працэсе работы.

## Перарваны палёт

***— Пасля таго як вы бліскуча скончылі Ленінградскую кансерваторыю, напэўна, у вас былі шматабяцальныя запрашэнні. А як апынуліся ў Мінску?***

— Сапраўды, такія запрашэнні былі. Адно з іх — у Сафійскі тэатр оперы і балета. У мяне жонка балгарка, і, зразумела, яна агітавала мяне паехаць працаваць на яе радзіму. Але гэтаму не суджана было збыцца. Мяне выклікалі ў Міністэрства культуры СССР і строга сказалі: «На вас паступіла заяўка з Мінска, галоўным балетмайстрам у Вялікі тэатр оперы і балета. Настойліва вам раім падумаць над гэтым».

Беларускі тэатр у той час быў якраз на гастролях у Кіеве. Я паехаў туды прыглядзецца. Балетная трупа ў мяне асаблівага захаплення не выклікала. Але калі крыху пазней я пабываў у Мінску, пабачыў сцэну Вялікага — раз і назаўсёды ў яе ўлюбіўся. Працаваць на такой шыкоўнай сцэне — мара любога харэографа. І я даў згоду.

***— Паслухайце, у дваццаць шэсць гадоў — і адразу на такую адказную пасаду. Не страшнавата было?***

— Вядома, страшнавата. Але мяне вельмі цёпла прынялі ў Мінску. Міністр культуры Беларусі Юрый Міхайлавіч Міхневіч (а гэта ён быў ініцыятарам майго запрашэння) даў мне карт-бланш у творчасці. Пашчасціла і з кіраўніцтвам тэатра. Яго дырэктар Мікалай Панцеляймонавіч Шаўчук, чалавек не выпадковы ў мастацтве, першы час пастаянна дапамагаў мне і словам, і справай.

***— А як сустрэла трупа?***

— Спачатку насцярожана. Глядзелі паблажліва. І гэта зразумела: прыйшоў нейкі хлапчук, мала каму вядомы харэограф, і будзе наводзіць тут парадкі. А перада мной былі ўжо паспяховыя майстры, народныя і заслужаныя артысты.

На шчасце, у мяне быў які-ніякі вопыт работы з выканаўцамі, акрамя таго, я дастаткова рана адчуў у сабе лідарскія якасці. А потым я зрабіў беспамылковы крок: далучыў да работы над сваім першым спектаклем найбольш здольную моладзь. А трэба сказаць, што тады ў тэатры сапраўды працавала шмат таленавітых танцоўшчыкаў: Людміла Бржазоўская, Юрый Траян, Віктар Саркісьян, Уладзімір Іваноў, Сяргей Пясцехін і іншыя. У іх быў стымул расці, і на рэпетыцыях яны працавалі з поўнай аддачай.

Калі прэм'ера спектакля (а гэта была «Кармэн-сюіта») прайшла з поспехам, усе астатнія паглядзелі на нас, і перш за ўсё на мяне, ужо са здзіўленнем і цікавасцю, а магчыма, нават з нейкай доляй зайздрасці. І таксама пацягнуліся да мяне.

***— Сямнаццаць гадоў, з 1992 да 2009-га, вы былі дырэктарам і мастацкім кіраўніком Нацыянальнага тэатра балета Беларусі. Ці ўсё з задуманага за гэты час удалося рэалізаваць?***

— Не ўсё. Жыццё, як заўсёды, уносіць у нашы планы свае карэктывы. Але многае ўсё ж было зроблена. Удалося не толькі ўтрымаць колькасны склад трупы, але і палепшыць яе якасць. Што, у сваю чаргу, адбілася на павышэнні мастацкага ўзроўню нашых спектакляў. У гэты няпросты час яны заўсёды ішлі з аншлагамі. Акрамя таго, мы шмат гастралявалі. А гэта дадатковы і дастаткова важкі даход. Адзін наш спектакль за мяжой каштуе ў разы больш, чым тут.

Магчыма, пэўныя страты я меў толькі ў асабістым плане. Аддаючы шмат часу адміністрацыйна-арганізацыйнай рабоце, я менш увагі надаваў уласнай творчасці. Хоць як сказаць. Тры гады мы з кампазітарам Андрэем Мдзівані вельмі шчыра працавалі над гістарычный пастаноўкай «Страсці», ствараючы яе абсалютна з нуля. У 1998 годзе адбылася прэм'ера балета «Жар-птушка» на музыку Стравінскага. У 2001 годзе ў маёй пастаноўцы выйшаў балет Чайкоўскага «Прыгажуня, якая спіць». У гэтыя ж гады ажыццявіў новыя рэдакцыі існуючых балетаў «Вясна свяшчэнная» Стравінскага, «Стварэнне свету» Пятрова, «Легенда аб Уленшпігеле» Глебава. Некалькі спектакляў былі пастаўлены за мяжой: «Дон Кіхот» Мінкуса ў Стамбуле, «Спартак» Хачатурана ў Анкары, «Эсмеральда» Пуні ў Токіа. Так што і ў плане творчасці быццам грэх скардзіцца.

***— Гром грымнуў нечакана. У 2006 годзе тэатр оперы і балета зачынілі на капітальны рамонт...***

— Так, непрыемнасці, якія неўзабаве пайшлі за гэтым, былі для мяне зусім нечаканымі. Тры гады, пакуль ішоў рамонт, я цягнуў балет, не маючы ўласнай сцэны, без рэпетыцыйнай базы. У Палац Рэспублікі, куды часова ўладкавалі, нас пускалі толькі ў дзень спектакля. Цяпер я нават здзіўляюся, як мы выжылі...

Пры гэтым я стараўся ўнікаць у некаторыя, найбольш істотныя, праблемы рамонту. Так, напрыклад, я дабіўся, каб у сцэны з'явіўся нахіл, які дасць магчымасць палепшыць відовішчнасць спектакляў. Дарэчы, такі нахіл маюць сцэны ўсіх галоўных тэатраў свету.

У адстойванні сваіх патрабаванняў даводзілася весці дастаткова рэзкія дыялогі ў Міністэрстве культуры. І, магчыма, такая мая настойлівасць камусьці ў міністэрстве не спадабалася. Таму, калі рамонт скончыўся, мне прапанавалі ўсяго толькі пасаду галоўнага балетмайстра, хоць была абяцана пасада дырэктара — мастацкага кіраўніка ўсяго тэатра. Гэта значыць, хацелі мяне вярнуць да таго, з чаго я пачынаў трыццаць пяць гадоў таму. Але апошняй кропляй, якая перапоўніла чашу майго цярпення, было рашэнне міністэрства прызначыць выконваючым абавязкі дырэктара тэатра чалавека, які нічым сябе не праявіў у мастацтве. І я напісаў заяву на звальненне.

## Вяртанне

***— Валянцін Мікалаевіч, а магчыма, вы дарма пагарачыліся, можа, трэба было самому пайсці да начальства, пагаварыць, паразумецца?***

— Гэта значыць, пайсці на кампраміс з самім сабой? Не, мне гонар ніколі не дазволіў бы гэта зрабіць. Вядома, такое рашэнне далося мне нялёгка: пайсці з трупы, з якой звязана ўся мая творчая дзейнасць, развітацца з тэатрам, якому быў аддадзены і лічыў сваім родным домам, — драматычны момант у маім жыцці. Але я не мог зрабіць інакш і не шкадую пра гэта рашэнне. Шкада толькі многіх нерэалізаваных творчых планаў. Дарэчы, я пайшоў з тэатра, але не з балета. Усе гэтыя дзевяць гадоў я быў запатрабаваны як харэограф, як балетмайстар. Выкладаў на кафедры харэаграфіі ў нашай Акадэміі музыкі, дзе, дарэчы, застаюся прафесарам і сёння.

***— Знаходзячыся па-за родным тэатрам, вы, мяркую, усё ж сачылі за тым, што адбываецца ў яго сценах?***

— Безумоўна. Стараўся бываць на ўсіх прэм'ерах — балетных і оперных. Але толькі па білетах. З 2009 года я ні разу не зайшоў у тэатр са службовага ўваходу. Проста мяне туды ніхто не запрашаў, як быццам я перастаў існаваць.

***— Настаў 2017 год. Набліжаўся ваш 70-гадовы юбілей. І раптам прапанова правесці ваш творчы вечар...***

— Гэта была ініцыятыва Міністэрства культуры. У ім змянілася кіраўніцтва, і, відавочна, змянілася стаўленне да мяне. Хоць дырэкцыя тэатра да апошняга супраціўлялася. Але, у рэшце рэшт, вымушана была саступіць. Мне нават далі не адзін вечар, а два. Прычым я настаяў, каб гэтыя вечары прайшлі на роднай сцэне, у тэатры оперы і балета.

Так і атрымалася. 31 кастрычніка я паказаў публіцы абноўлены «Спартак», а 2 лістапада адбыўся вялікі гала-канцэрт зорак беларускага і сусветнага балета.

***— Пасля гэтых трыумфальных урачыстасцяў вам нарэшце прапанавалі вярнуцца ў тэатр... І як вас сустрэлі ў трупе?***

— Сустрэлі вельмі добра. Добразычліва. Усе засумавалі па сапраўднай творчай рабоце. Выказалі пажаданне як найхутчэй навесці парадак у рэпертуарнай палітыцы. Чым я, уласна, адразу ж і заняўся.

З моманту вяртання я паставіў ужо ў абноўленай рэдакцыі пяць спектакляў. Гэта — «Спартак», «Шчаўкунок», «Стварэнне свету», «Кармэн-сюіта» і «Рамэа і Джульета». І мне прыемна, што яны запатрабаваны, збіраюць поўныя залы.

**Гутарку вёў**
**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

# АЛЬБО ПРАСЦІ, АЛЬБО ТКАЦЬ, АЛЬБО ПЕСЕНЬКІ СПЯВАЦЬ

**Усе мы калі-небудзь у жыцці выбіралі сабе дарогу. Яшчэ Сент-Экзюперы казаў: «У кожнага чалавека свае зоркі. Адным — тым, хто вандруе, — яны паказваюць шлях. Для іншых гэта проста агеньчыкі». Сёння наша гутарка паміж Сяргеем Куркачом і Лізаветай Танана прысвечана выбару прафесіі для хлопцаў і дзяўчат. Мы паспрабуем на ўласным прыкладзе разабрацца, ці зможа Лізавета, напрыклад, стаць трэнерам па таэквандо, машыністам метрапалітэна або шахцёрам. Сяргей Куркач змяніў шмат прафесій, хоць у дзяцінстве марыў вязаць шалікі. А змог бы стаць майстрам па пазногцях?..**

## Буданы ў кожнага свае

**Сяргей:** Дарагая мая студэнтка БДУ, не паверу я, што, калі была школьніцай, ты сваю будучую прафесію журналісткай называла. Пэўна, мадэллю або спявачкай марыла быць?

**Лізавета:** Былі і такія думкі, вядома, але ўсё не так адназначна. Мне заўсёды падабаліся самыя разнастайныя прафесіі, неяк нават хацела, як тата, быць разьбяром па драўніне: было цікава працаваць з дрэвам.

**«Так, пажарным у нашай краіне жанчыне быць нельга, што я лічу вельмі несправядлівым. І наогул, думаю, што камусьці нешта забараняць — няхай гэта будзе нават у адносінах мужа і жонкі — гэта зноў жа дыскрымінацыя. Быццам бы жанчыны апроч таго, як нараджаць дзяцей, нічога не могуць і не павінны, а пад забарону трапляюць менавіта тыя прафесіі, што якім-небудзь чынам могуць нашкодзіць рэпрадуктыўнай здольнасці жанчыны. У большасці выпадкаў гэтыя ж прафесіі таксама згубна ўплываюць на мужчын, але вось у іх права выбару ніхто не адымае».**

**Сяргей:** Ты яшчэ скажы, што пілу з малатком у руках трымаць умееш. Можа, нават ведаеш, што такое стамеска?

**Лізавета:** Вядома, ведаю, крыўдзіце. Мы з братамі заўсёды нешта майстравалі, пісталеты ўсякія, стрэльбы, лукі — хоць мне цікавей было домікі-буданы рабіць. А вось вы гэбель у руках даўно трымалі?

**Сяргей:** Напэўна, трымаў. Даўно гэта было... Ты вось кажаш буданы. А да рэальных пабудоў справа, пэўна, не дайшла.

**Лізавета:** У-у-у, ну тут зусім ужо мяне недаацэньваеце. Буданоў у маім жыцці было шмат, а самы апошні адносна нядаўна нават будавала, калі ў класе дзясятым была. І ведаеце, дзе? На высачэзным дубе, за пяць метраў ад зямлі. Нават фатаграфіі засталіся, праўда, там ён не зусім дабудаваны. Да гэтага часу памятаю, як, седзячы на галіне, забівала ў тую ж галіну цвікі... А потым у гэтым будане на гітары ігралі, нават агонь у старой каструлі разводзілі і «шашлыкі» пяклі.

## «Недзявочых» прафесій не бывае?

**Сяргей:** Кажаш, у цябе павучыцца мог сталяр-вышыннік? Не зусім дзявочая прафесія.

**Лізавета:** Наогул, у нас па Канстытуцыі забаронена дыскрымінаваць людзей: па поле, расе, нацыянальнасці, рэлігійных ці палітычных поглядах. Так што гэта ваша «недзявочае» вы з лексікону прыбірайце.

**Сяргей:** А вось у Працоўным кодэксе змяшчаецца агаворка: «не лічацца дыскрымінацыяй любыя адрозненні, выключэнні, перавагі і абмежаванні, напрыклад абумоўленыя неабходнасцю асаблівага клопату дзяржавы аб асобах, якія маюць патрэбу



З такім тварам Сяргею Куркачу толькі шалікі і вязаць.

ў павышанай сацыяльнай і прававой абароне». Да такіх «агаворак» якраз-такі адносяць у тым ліку і жанчын. І для іх ёсць распрацаваны спіс забароненых прафесій. У гэтым спісе іх 182.

**Лізавета:** Ведаю я пра гэты спіс. Наогул, у нашай краіне жанчыны даўно хочуць яго адмяніць. Ён парушае правы на свабодны выбар прафесіі або род працы. У лютым гэтага года Цэнтр па прасоўванні правоў жанчын нават праводзіў інфармацыйную кампанію па яго адмене.

**Сяргей:** Перад тым як у гэтую «фемінісцкую гульню» ўступаць, ты лепей паглядзела б, што там за прафесіі. Я не хацеў бы, каб маці маіх дзяцей працавала майстрам па адліўцы, пракатцы і штампоўцы свінцовых вырабаў. Ці вось, напрыклад, ёсць такая прафесія — спецыяліст «па размолцы ртутнага прэцыпітату». Тут адна назва чаго толькі варта! А ртуць — рэч даволі небяспечная.

**Лізавета:** Маці вашых дзяцей, як вы сказалі, наогул нідзе не працавала. А, па сутнасці, тут сапраўды дыскрымінацыя: гэтыя прафесіі небяспечныя самі па сабе, незалежна ад таго, хто на іх працуе: мужчыны ці жанчыны. Толькі вось забараняюць чамусьці менавіта жанчынам.

**Сяргей:** Ты маю жонку не чапай, калі ласка, гэта мой боль. Яна ў мяне ў дзяцінстве пажарным быць хацела. Але гэта сапраўды небяспечная прафесія, я асабіста не пусціў бы яе туды.

**Лізавета:** Так, пажарным у нашай краіне жанчыне быць нельга, што я лічу вельмі несправядлівым. І наогул, думаю, што камусьці нешта забараняць — няхай гэта будзе нават у адносінах мужа і жонкі — гэта зноў жа дыскрымінацыя. Быццам бы жанчыны апроч таго, як нараджаць дзяцей, нічога не могуць і не павінны, а пад забарону трапляюць менавіта тыя прафесіі, што якім-небудзь чынам могуць нашкодзіць рэпрадуктыўнай здольнасці жанчыны. У большасці выпадкаў гэтыя ж прафесіі таксама згубна ўплываюць на мужчын, але вось у іх права выбару ніхто не адымае.

**Сяргей:** Якая вы, моладзь, някемлівая. Гэтым забароненым спісам мы, мужчыны, жанчын засцерагаем. Цяжкая фізічная праца пад зямлёй мужчыну загартоўвае, а жанчыну можа зламаць. І так мы турбуемся аб будучых дзецях.

**Лізавета:** А што рабіць тым жанчынам, якія дзяцей наогул не хочуць? Ці не могуць іх мець? Ці тым, у якіх ужо ёсць дзеці і больш нараджаць яны свядома не хочуць? Жанчын пазбаўляюць гэтага права без разбору, нягледзячы на сітуацыю. Хоць, магчыма, яны хацелі б стаць вадалазамі, цеслярамі і мець магчымасць выбраць любую прафесію з гэтага вялізнага спіса.

**Сяргей:** На гэта магу адказаць, што калі такія работы не адносяцца да шкодных і (або) небяспечных, пасля атэстацыі працоўных месцаў па ўмовах працы, то жанчына можа там працаваць.

**Лізавета:** Ну хоць нейкая паблажка.

**Сяргей:** Я вось, напрыклад, таксама не згодны з уняесеннем некаторых прафесій у гэты спіс: напрыклад, «па нарыхтоўцы пладоў, лекавай сыравіны з кустоў і дрэў, якія растуць (з узддымам на вышыню вышэй за 1,3 м)». То-бок у жанчыны галава закружыцца ад такой вышыні, а ў мужчыны — не?

**Лізавета:** Вось мы ўсё аб «мужчынскім», аб забароненым. А вы калі-небудзь хацелі працаваць на такой працы, якая стэрэатыпна «жаночай» лічыцца?



**Сяргей:** Мая старэйшая сястра неверагодна ўмела (ды і цяпер умее) вязаць пруткамі. Так мне гэта спадабалася, як у яе добранька ўсё атрымліваецца, што пруткі ўзяў у рукі і я. І ты ведаеш, я аказаўся добрым вучнем — звязаў доўгі бела-чорны шалік. Як цяпер памятаю, вязаў «англійскай рызінкай». Таксама ўслед за сястрой навучыўся на швейнай машынцы шыць. І гэта ўменне мне дапамагае нават цяпер: пакараціць джынсы, навалачку пашыць ці прасціну. Гэтыя ўменні маёй прафесіяй не сталі, але ўжо нялішнія дакладна. Праўду кажуць: запас бяды не чыніць.

## Самая добрая праца — гэта высокааплатнае хобі

**Сяргей:** Памятаю адно крылатае выслоўе Джэка Хэрлі: «У кожнага юнака ёсць захапленне, і самае лепшае з іх — захапленне мастацтвам рабіць грошы». Толькі не заўсёды хобі грошы прыносіць. Напрыклад, мая старэйшанькая ў дзіцячым садзе як заспявала, так і цяпер у дарослай групе ўжо спявае. Але вось спевамі толькі як хобі займаецца. Класная рок-група ў яе, толькі грошы на музыцы не заробіш. Тэсціроўшчыкам яна працуе ў адной IT-кампаніі.

**Лізавета:** Я таксама неяк вакалам займалася і ў музычнай школе вучылася. Толькі там вучылася не вакалу, а на фартэпіяна іграць. Хоць ніколі не хацела, каб гэта стала маёй прафесіяй, гэта больш як хобі было. Праўда, мама настойвала на тым, што ў выпадку чаго магу акампаніятарам працаваць у дзіцячым садку.

**Сяргей:** А я ў школьныя гады (з другога да дзясятага класа) на секцыю па дзюдо хадзіў, на спаборніцтвы ездзіў. Быццам бы тады нават кандыдатам у майстры спорту стаў. Гэта цяпер у нас прафесійныя добрыя спартсмены сабе на жыццё зарабляюць, займаючыся спортам. У 80-я пра гэта ніхто і марыць не мог. Я потым на цяжкія 90-я пару месяцаў трэнерам па таэквандо быў. Кажуць, зараз модна гэтым відам спорту займацца якраз дзяўчатам. Ты трэнерам ніколі не хацела быць?

**Лізавета:** Біцца на кулаках мяне аднакласнікі навучылі, хоць калі і білася, то толькі па справе, ніколі гэта проста забаўкай не было. А спорт і я — на розных паралелях. І трэнерам мне ніколі не хацелася быць. Вось вы казалі, у вас прыклад быў — бацька ў раёне старшынёй камітэта фізкультуры і спорту працаваў. А я вясковая: у нас замест спорту — градкі, сена — як мама кажа — «фітнес».

**Сяргей:** А наша з табой прафесія далёка не для ўсіх людзей, якія словы ў сказы складаць умеюць. Кажуць, што журналістам трэба нарадзіцца, гэтаму ніхто не навучыць. Мая жонка, напрыклад, журфак скончыла, а ў газеце працую я. У школе я сачыненні на вольную тэму цікавыя пісаў, ужо тады з настаўнікам рускай мовы і літаратуры пра жыццё спрачаўся. І думкі свае юнацкія перанасіў на паперу. А бацькі мяне прымусілі радыётэхнічны інстытут скончыць. Потым год прапрацаваў на заводзе, тэлевізары збіраў, працаваў грузчыкам. А ўсё роўна праз хобі сваё — людзям цікавыя рэчы распавядаць — мая прафесія мяне знайшла. Вось ужо 26-ы год працую журналістам.

А ты як у журналістыку трапіла? Тата мэблю збірае, мама — швачка. На каго раўнялася?

**Лізавета:** Ну, наогул, мама швачка толькі па адукацыі. А так шмат гадоў культработнікам была. Спачатку працавала мастацкім кіраўніком, а потым і дырэктарам сельскага Дома культуры. Так што дакладна магу сказаць: у маму пайшла.

**Сяргей:** А магла б быць цесляром-вышыннікам... А, не магла б, у спіс трапляеш.

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Лізавета ТАНАНА.**
**Фота Маргарыты ПАЛЮХОВІЧ,**
**з асабістага архіва.**



Лізавеце спяваецца на дубе значна лепш.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов** – бывшая в употреблении
Местонахождение: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Заводская, 4

| Номер лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Машина лесная погрузочно-транспортная МПТ-461.1**, рег. знак АВ-1 7266, 2010 г. в., инв. № 9327/2 | **32 100,36** |
| 2 | **Машина лесная погрузочно-транспортная МПТ-461.1**, рег. знак АК-1 3089, 2014 г. в., инв. № 0301 | **36 926,47** |
| 3 | **Машина лесная погрузочно-транспортная МПТ-461.1**, рег. знак АВ-1 6649, 2010 г. в., инв. № 9326 | **32 100,36** |
| 4 | **Тягач трелевочный «Амкодор-2243В»**, VIN Y2243B0000110036, 2011 г. в., инв. № 5202 | **50 198,28** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** после проведения торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 06.12.2021 в 11.00. Окончание торгов: 06.12.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.12.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2021.Б.002.00041

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Обществу с ограниченной ответственностью «ВТП», УНП 391418293, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 13-9Б/2020 в экономическом суде Витебской области.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

**Лот № 1: недвижимое имущество.**

Капитальное строение с инв. № 200/С-107796, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 39-й Армии, газопровод вблизи зданий №№ 26–54, протяженностью 327,4 м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – газопровод.

**Начальная цена**: 5 756,00 белорусских рублей без НДС.

**Минимальная цена:** 3 454,00 белорусских рублей без НДС.

**Условия электронных торгов:** Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, согласно сметы затрат, и оплатить услуги ЭТП согласно Прейскуранту ЭТП, заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: нет.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: 03.12.2021 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by/.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до **16.00 02.12.2021**.

**Задаток по лоту № 1 в сумме 575,60** (пятьсот семьдесят пять рублей 60 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Справочная информация:

Контактный телефон антикризисного управляющего: +375 29 711-43-22.

Контактный телефон для осмотра объектов: + 375 29 711-43-22.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов): в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения предмета электронных торгов по предварительному согласованию с Продавцом.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат и прейскуранта ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by/ до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вишнёвка-2010» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

- **коровник** с инв. № 600/С-128546 общей площадью **875 кв. м,**
- **коровник (пункт искусственного осеменения)** *(составные части и принадлежности: пристройка)* с инв. № 600/С-128638 общей площадью **839,1 кв. м,**
- **зерносклад** с инв. № 600/С-129046 общей площадью **298,6 кв. м,**
- **навозохранилище (сооружение)** с инв. № 600/С-128636, площадь застройки – **1396 кв. м**.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **623688200001000493** площадью **1,9102 га** (право постоянного пользования) по адресу: **Минский район, Юзуфовский с/с, район д. Лусково.**

*На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью 0,1016 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 100 вольт, площадью 0,2469 га.*

Начальная цена объекта с НДС (20 %) **– 212 488,80 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены **– 21 248,88 бел. руб.**

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в следующем размере: 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона.

**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 05.09.2019, 13.11.2019, 01.04.2020.

Аукцион состоится **15.11.2021** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.11.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8029) 138-21-95.**

УНП 600041880

Открытое акционерное общество
## «Дорожно-строительный трест № 3»
**11 ноября 2021 года в 11.00**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Автомобиль «КРАЗ-250», тип ТС-специальная (автокран КС 4562 на базе КРАЗ-250), 1992 год выпуска, регистрационный знак – ТЕ 4090, кузов (рама) № 0742265, инвентарный номер 710** | 13 200,00 | 1320,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **11 ноября 2021 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: **212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33;** дата: **09.11.2021 г.**, время: **17.00.**

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## ОАО «Пинский винодельческий завод»

**сообщает о проведении 18.11.2021 г. третьих электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:**

1) **ГРУЗОВОЙ ФУРГОН GAZ-33021 1999 г. в.,** государственный номер АК 4416-1 кузов X1A270700Y0000303, № инв. 456 – 2 030 бел. руб. без НДС.
2) **ГРУЗОВОЙ ФУРГОН ГАЗ 53А 1980 г. в.,** государственный номер АА 9465 кузов 0466350, № инв. 411 – 1 890 бел. руб. без НДС.
3) **ГРУЗОВОЙ ФУРГОН ГАЗ 53 1977 г. в.,** государственный номер АА 4943-1 кузов 0219333, № инв. 4162 – 1 820 бел. руб. без НДС.
4) **ГРУЗОВОЙ ФУРГОН ГАЗ 3307 1993 г. в.,** государственный номер АК 4483-1 кузов XTH330700P1562542, № инв. 473 – 2 310 бел. руб. без НДС.

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by.**

УНН 200110728

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
## по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно
## 7 декабря 2021 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Гродненская область, г. Гродно, ул. Полянная, 53 (У-416, микрорайон «Барановичи 5,6») 440100000003005047 | 0,0948 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 11 %. Фундамент: бетон; стены: кирпич силикатный; наружная площадь (площадь застройки): 127 (130) кв. м; общая площадь здания: 37,6 кв. м. Подвал, площадь 55 кв. м; стены кирпич силикатный, перекрытия плит ж/б; пол бетон | 346,80 | 33 729,63 (15 347,91; 18 381,72) | 6 700 |

** – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).*

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 7 декабря 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 8 ноября по 1 декабря 2021 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный подавший заявление на участие в аукционе в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 626055, 626056.**

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object/, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

# Новыя магчымасці, новыя рашэнні

## Як выжываюць бібліятэкі ва ўмовах пандэміі

**Пытанне аб тым, што пад уплывам развіцця лічбавых тэхналогій бібліятэкам рана ці позна давядзецца пераходзіць у анлайн, заўсёды было актуальным. Але яшчэ два гады таму ніхто і ўявіць не мог, наколькі хутка ўстановам давядзецца асвойваць інтэрнэт. Вымушаныя сысці на каранціны, бібліятэкі працягвалі працаваць са сваімі чытачамі — больш за тое, заваёўвалі новую аўдыторыю, крэатывілі, запускалі цікавыя праекты, наладжвалі доступ да інфармацыі і пакрысе вучыліся канкурыраваць з іншымі вытворцамі віртуальнага кантэнту. Таму VIII Міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры» быў прысвечаны абмену вопытам, назапашаным у час работы ў непрадказальных ковідных умовах і прайшоў пад лозунгам «Бібліятэкі ва ўмовах пандэміі: новыя магчымасці, новыя рашэнні».**



Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства культуры, Нацыянальная бібліятэка, Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя. У рабоце кангрэса прынялі ўдзел больш за 350 дэлегатаў з 8 краін. Сярод іх — супрацоўнікі бібліятэк, адукацыйных устаноў, выдавецтваў, вытворцы інфармацыйнай прадукцыі і абсталявання. Актуальныя пытанні абмяркоўваліся падчас канферэнцыі, круглых сталоў і майстар-класаў, працавала выстаўка выдавецкай прадукцыі, электронных інфармацыйных сэрвісаў і рэсурсаў.

### МЫ ІДЗЁМ ДА ВАС

Як заўважыў падчас адкрыцця кангрэса **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ**, гэта дыялогавая пляцоўка дазваляе кансалідаваць намаганні для стварэння адзінай інфармацыйна-бібліятэчнай прасторы. Сёння сукупная бібліятэчная сетка Беларусі налічвае больш як 7 тысяч публічных і спецыялізаваных бібліятэк з агульным фондам звыш 180 млн экзэмпляраў. Больш чым 100 тысяч карыстальнікаў звяртаюцца да паслуг бібліятэк на дыстанцыі праз інтэрнэт-сайты. І гэта лічба ў час пандэміі працягне расці. Прыярытэтным кірункам у фарміраванні інфармацыйных тэхналогій у сучасных бібліятэк стала набыццё імі сеткавых электронных інфармацыйных рэсурсаў, якія ўтрымліваюць вялікія масівы інфармацыі, пастаянна папаўняюцца, маюць зручны для карыстальніка інтэрфейс і не патрабуюць плошчаў для захоўвання.

Адно з першых пытанняў, якое паўстала перад бібліятэчнымі ўстановамі падчас пандэміі: як наладзіць бяспечнае абслугоўванне чытачоў? Бібліятэкі ўводзілі каранціны для кніг, якія карыстальнікі вярталі пасля прачытання, апрацоўвалі дакументы абеззаражвальнымі сродкамі, дастаўлялі літаратуру на дом, укаранялі анлайн-паслугі і сэрвісы, развівалі свае сайты, вялі акаўнты ў сацыяльных сетках. Некаторыя бібліятэкі пачалі прымаць папярэднія заказы на кнігі, каб скарацiць знаходжанне чытача ва ўстанове — яму трэба было проста завітаць за сваёй літаратурай у прызначаны час.

Часовыя каранціны, адток наведвальнікаў у пачатку пандэміі выклікалі разгубленасць і няўпэўненасць, але вельмі хутка бібліятэкі змаглі прыстасавацца да новых умоў і запусціць ініцыятывы, якія будуць запатрабаваныя і ў постковідныя часы. Так праблемы ператварыліся ў пошукі новых магчымасцяў. Відэаролікі, віртуальныя прэзентацыі і выстаўкі, віктарыны і квэсты — далёка не ўсе прапановы, з якімі за гэты час выходзілі бібліятэкі. Перад імі паўстала амбіцыйная задача: не толькі захаваць сваіх наведвальнікаў, але і стварыць для іх новыя магчымасці доступу да інфармацыі. Так, супрацоўнікі Светлагорскай раённай сеткі бібліятэк запусцілі праект «Бібліятэка. Перазагрузка», у межах якога праводзіліся відэаагляды, творчыя лабараторыі, майстар-класы, гучныя чытанні, музейныя відэарэпартажы, стваралася дасье на пісьменнікаў, распрацоўваліся новыя фарматы зносін з наведвальнікамі, вялася пошукава-даследчыцкая работа, у межах якой збіраліся факты пра населеныя пункты раёна і знакамітых землякоў.

На працягу некалькіх гадоў супрацоўнікі Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы працуюць над стварэннем уласных інтэлектуальных прадуктаў, сярод якіх — віртуальны даведнік па вуліцах горада, калекцыя цікавых фактаў пра раён і слоўнік мясцовых тапонімаў. А за час каранавіруса быў алічбаваны і матэрыял, які датычыцца гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Калі з-за пандэміі сацыяльна-масавыя мерапрыемствы былі адменены, супрацоўнікі бібліятэк паспрабавалі перавесці іх у анлайн. Так, Нацыянальная бібліятэка свой праект «На хвалі часу, у плыні жыцця», прысвечаны пісьменнікам-маладнякоўцам, пачала актыўна прасоўваць праз інтэрнэт. Відэапрэзентацыі, семінары і анлайн-конкурсы дазволілі прыцягнуць увагу віртуальных карыстальнікаў з розных куткоў Беларусі.

Бібліятэкі Магілёва вырашылі выкарыстаць сучасныя тэхналогіі для прасоўвання беларускай літаратуры і культуры сярод моладзі. Супрацоўнікамі падрыхтаваны інтэрактыўныя плакаты аб класіках з малавядомымі фактамі з іх жыцця і дзейнасці, віртуальныя і інтэрактыўныя выстаўкі і літаратурныя боксы аб кнігах, прамыя эфіры і відэастрымы з сучаснымі аўтарамі, аўдыякнігі, квэсты, чэленджы, фотаакцыі.

### НОВЫЯ ТРЭНДЫ

Сёння бібліятэкі перасталі быць проста месцам, дзе захоўваюць і выдаюць кнігі. Паступова яны ператвараюцца ў гарадскія прасторы, дзе можна цікава і карысна правесці час. Да таго ж, ковід узмацніў патрэбы ў элементарных чалавечых зносінах, і ўжо пры спрыяльных эпідэміялагічных умовах бібліятэкі будуць здольныя збіраць усіх тых, хто прагне сустрэч, знаёмстваў і адкрыццяў.

Ужо сёння пры многіх з іх дзейнічаюць клубы, тут выступаюць пісьменнікі і акцёры, мастакі выстаўляюць свае карціны.

Бібліятэкі сталі больш даступныя для карыстальнікаў — чытачы могуць атрымаць звесткі, не выходзячы з дому, што звязана са стварэннем і развіццём электронных інфармацыйных рэсурсаў — сэрвісаў і віртуальных службаў. Пры гэтым можна працаваць як з нацыянальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі, так і з ліцэнзаванымі базамі даных розных краін свету. Як адзначыла **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Аксана КНІЖНІКАВА**, сучасная бібліятэка павінна функцыянаваць як адзіная тэхналагічная сістэма, у якой усе яе рэсурсы і схемы працуюць у інтэграцыі як адзін з адным, так і са знешнім светам. Менавіта на гэта накіравана лічбавая трансфармацыя бібліятэк. У межах кангрэса прайшоў таксама семінар, дзе абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з аблягчэннем доступу да інфармацыйных рэсурсаў людзей, якія маюць праблемы са зрокам ці іншыя фізічныя адхіленні.

Сёння перад бібліятэкамі паўсталі такія задачы, як адміністраванне электронных рэсурсаў і інфармаванне чытачоў аб новых магчымасцях. Гэтыя ўстановы таксама з'яўляюцца стваральнікамі віртуальнага кантэнту, актыўна алічбоўваюць уласныя фонды, «пераварваюць» вялікія масівы інфармацыі і на аснове іх ствараюць уласныя прадукты. Веды гэтыя ў далейшым будуць укладзены ў адукацыю і, як вынік, у эканоміку і стварэнне лепшага асяроддзя.

Ва ўмовах пандэміі карыстальнікі хутка адаптаваліся, і колькасць спампаваных дакументаў і праглядаў пачала расці. Тэндэнцыя актыўнага пераходу падпісчыкаў з друкаваных выданняў на электронныя захаваецца і ў постковідныя часы.

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ БУДУЧЫНІ

Паступова бібліятэкі ператвараюцца ў «разумныя дамы». Ужо сёння існуюць сістэмы і абсталяванне, здольныя значна спрасціць работу ўстаноў. Так, разумныя машыны могуць праводзіць інвентарызацыю кніжнага фонду: спецыяльны радар дазваляе хутка знаходзіць патрэбную літаратуру. Разумныя паліцы сочаць за месцазнаходжаннем і вяртаннем кніг і пры дапамозе пэўнага праграмнага забеспячэння даюць статыстыку па выдачы дакументаў і вызначаюць найбольш папулярныя выданні. Дзякуючы сучасным тэхналогіям наведвальнікі могуць самастойна браць і вяртаць кнігі. Сістэмы распазнавання твараў ужо здольныя ідэнтыфікаваць чытача, нават калі той не мае з сабой чытацкага білета. Такая тэхніка можа вызначыць пол і ўзрост наведвальнікаў і даць справаздачу аб тым, які кантынгент завітаў на пэўнае мерапрыемства. Распрацаваны і аўтаматызаваныя гардэробы, у выніку чаго для абслугоўвання чытача ўжо можна не задзейнічаць персанал.

Але ці азначае гэта, што прафесія бібліятэкара можа знікнуць? Удзельнікі кангрэса ўпэўнены, што ўсё ж будучыня бібліятэк будзе завязана на працы людзей, хаця тут не абыдзецца без сур'ёзнай трансфармацыі. Такія спецыялісты павінны будуць не толькі ўмець ствараць новыя інфармацыйныя прадукты, але і ведаць, як працаваць з вялікай аўдыторыяй і арганізоўваць мерапрыемствы, мець навыкі публічных выступленняў. Колькасць інфармацыі з кожным годам будзе павялічвацца, і бібліятэкары, якія ўмеюць арыентавацца ў ёй і знаходзіць неабходныя веды, акажуцца вельмі карыснымі. Праўда, трэба быць гатовым да таго, што такі персанал павінен на працягу ўсяго свайго жыцця навучацца сачыць за тэхналогіямі і гнутка перастройвацца. Магчыма, у будучыні гэта прафесія стане гучаць як «бібліятэкар 5.0» альбо «архітэктар падзей».

Дзеля памяці

# СЛЕД НА ЗЯМЛІ



**Не стала вядомага беларускага археолага, гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навук Беларусі, галоўнага навуковага супрацоўніка аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вольгі Мікалаеўны Ляўко.**

Асноўная ўвага даследчыцы была скіравана на вывучэнне пытанняў айчыннай сярэдневяковай гісторыі і археалогіі, этна- і культурагенезу славян, фарміравання і развіцця раннедзяржаўных структур, тэрытарыяльна-адміністрацыйных утварэнняў IX—XVIII стагоддзяў. Але канчатковая ацэнка ўсіх здабыткаў гэтага вучонага яшчэ наперадзе. Сёння, несумненна, што яе працы дазволілі больш даведацца пра багацце і асаблівасць матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускіх земляў. Шмат ёю зроблена для захавання і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны. Многія населеныя пункты змаглі набыць рысы свайго гістарычнага аблічча. І, бясспрэчна, веды, здабытыя даследчыцай, яшчэ доўгі час будуць аказваць уплыў на культурнае і нават сацыяльна-эканамічнае развіццё населеных пунктаў, гісторыю якіх яна вывучала.

— Мне падаецца, што Вольга Мікалаеўна Ляўко была своеасаблівым рухавіком навуковых дасягненняў, навукоўцам працоўным, чалавекам, які ўсё сваё жыццё прысвяціў фарміраванню гістарычнай самасвядомасці, светапогляду, захавання гістарычнай памяці, — гаворыць **дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім ЛАКІЗА**. — Яна рабіла ўсё для таго, каб гісторыка-культурная спадчына была запатрабавана не толькі ўнутры нашай краіны, але і па-за яе межамі. Сярод дзясяткаў даследаваных помнікаў археалогіі (гарадоў, замкаў, селішчаў, пахавальных помнікаў) — Віцебск, Орша, Копысь, Шклоў, Гарадок, Езярышча, Кісялі, Талачын, Арэхаўск, Смалькі і шэраг іншых населеных пунктаў. Даследаванні не мелі аналагаў у гісторыі археалагічнай навукі Беларусі. Яна першая, хто пачаў займацца культурнымі напластаваннямі XVII—XVIII стагоддзяў, позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Сёння нават цяжка ўявіць, хто мог бы зрабіць столькі, колькі Вольга Мікалаеўна. Колькі здзейснена па ахове археалагічнай спадчыны ў Віцебску, у горадзе, які яна любіла, якому аддала частку свайго навуковага жыцця падчас археалагічных даследаванняў, дзе ведала ўсю гісторыка-культурную спадчыну і працавала з людзьмі, якія павінны займацца захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны.

Варта адзначыць работу, якую Вольга Мікалаеўна зрабіла па прапагандзе гісторыі беларускай дзяржаўнасці, Полацкага княства ў першую чаргу. Полацк як калыска беларускай дзяржаўнасці раскрыўся ў многіх яе работах. Яна заўсёды старалася паказаць значнасць гэтага горада, значнасць нашай краіны тысячу гадоў таму. Калі мы рыхтавалі матэрыялы топ-5 археалагічных даследаванняў 2021 года, якраз туды аднеслі і археалагічныя работы, што ў Верхнім замку вяліся пад кіраўніцтвам Вольгі Мікалаеўны.

Важна сказаць і пра навуковы ўклад вучонай у разуменне тых гістарычных працэсаў, якія адбываліся на нашай тэрыторыі. Яе энергія была накіравана на вывучэнне пэўных аб'ектаў. Напрыклад, у 2016 годзе яе праца «Кардон — новы археалагічны комплекс эпохі вікінгаў (VIII—X стст.) ва Усходняй Еўропе», якая выконвалася пад кіраўніцтвам В. М. Ляўко, увайшла ў топ-10 вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі. Гэта ўнікальны помнік, звязаны са шляхам «з варагаў у грэкі». Вольга Мікалаеўна з калегамі даказала, што гэты шлях праходзіў па тэрыторыі сучаснай Беларусі і што ён быў вядомы нашмат раней, чым шлях па тэрыторыі сучаснай Смаленшчыны. Гэта велізарны ўклад у разуменне гістарычных працэсаў. Шмат Вольга Мікалаеўна зрабіла і ў вывучэнні славянскай праблематыкі і як даследчык, і як генератар ідэй.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Пісьменніцкія вандроўкі

# ЗЕМБІН: ЛІРЫЧНЫ ЎСТУП, ГІСТАРЫЧНЫ ПРАЦЯГ

**Як казаў Уладзімір Караткевіч, вандруючы па Беларусі, «гэтую зямлю нельга глядзець стомленымі вачыма, яна такая адна, і перад ёю, як перад сур'ёзнай кнігай, павінен быць пралог або хаця лірычны ўступ».**

Кожны раз, калі мы выпраўляемся ў вандроўкі па закінутых сядзібах, напаўразбураных храмах, млынах і броварах, такім лірычным уступам для мяне з'яўляюцца гістарычныя падзеі... Знайсці штось нечаканае, каларытнае можна паўсюль. У адной сядзібе, перапланаванай у сучасны афіцыйны будынак, — трывожна-чырвоная цэгла, схаваная пад бляклa-жоўтай тынкоўкай, еўравокны, бляшаны дах — выявіўся сапраўдны авантурны сюжэт. Дачка пана захакалася ў садоўніка-немца, такога мужнага, што адзіны не баяўся сварыцца з акрутным панам-палкоўнікам... І ці не праз гэтае вакно другога паверха паненка вылезла да свайго каханага па звязаных прасцінах? У другой сядзібе, прыстасаванай пад калгасныя канторы, у сутарэннях, закіданых паламанымі крэсламі і пластыкавымі бутэлькамі, некаторыя заблуканцы чуюць, як праязджае карэта — стукаюць па брукаванцы капыты коней, пагрукваюць колы...

Нават пра самае вядомае месца можна выявіць для сябе штось загадкавае...

## «Акрываўлены камень у чыстай сцяне»

У Зембін, былое ўладанне Радзівілаў, мы заехалі пасля наведвання безыменнай капліцы XIX стагоддзя. Уражанні былі сумныя: цямнеюць на ўзгорку, у атачэнні бярозак, агрызкі сцен — заходзьце, усе вятрыскі, завітвай, дождж... Пасярэдзіне некалькі дзён таму нехта расклаў вогнішча — спадзяюся, ад няведання, што бульба пяклася на чужой магіле...

У Зембіне мы таксама кіраваліся найперш да канкрэтных руін — а менавіта касцёла Унебаўзяцца Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Усё, што тады ведалася, — будаваўся ў XVIII стагоддзі для дамінікан, з фундацыі тагачасных уладальнікаў мястэчка падкаморага ашмянскага Адама Саковіча і яго жонкі Мар'яны з Тышкевічаў. У 1790-м драўляны касцёл згарэў, замест яго ўзвялі каменны... А ў 1932-м культавае збудаванне зачынілі. Галоўны алтар упрыгожвала карціна знакамітага мастака Яна Дамеля — не пашанцавала гэтаму майстру. На Беларусі, якой ён аддаў галоўны



свой плён, амаль не засталося яго карцін.

Да зембінскага касцёла мы пад'ехалі не адны — побач прыпаркавалася машына з гэткіх жа вандроўнікаў. Хлопец з дзяўчынай, якія ўжо агледзелі руіны, пыталіся, як прайсці да рэшткаў міквы, яўрэйскага рытуальнага збудавання...

Так, Зембін — тыповае беларускае мястэчка, дзе сустракаліся розныя культуры, дзейнічалі касцёл, царква і сінагога. І яўрэяў жыло шмат... Падчас вайны было знішчана фашыстамі мясцовае гета, закатаваных 927 яўрэяў... Сёння там мемарыял, і страшна чытаць, як каты бязлітасна забівалі дзяцей, жанчын, старых...

Дарэчы, праз Зембін праходзіць вуліца беларускага яўрэйскага паэта Ізі Харыка, які нарадзіўся тут, у сям'і шаўца. Ізі Харык сам пісаў на ідышы, перакладаў Якуба Коласа і Міхася Чарота, быў настолькі папулярны ў часы «Маладняка» і «Узвышша», што на яго выступленні набіваліся поўныя залы... Юрка Гаўрук успамінаў пра яго сустрэчу з чытачамі ў Горацкай сельгасакадэміі: *«Я ніколі не забуду той атмасферы давер'я, зацікаўленасці, любові і пашаны, якая адразу ж устанавілася паміж паэтам і яго слухачамі. Ізі Харык чытаў многа, з вялікім уздымам. Яго гучны, выразны голас з пявучай інтанацыяй, запал, аптымізм і публіцыстычная вастрыня вершаў літаральна зачаравалі вучняў. Твары іх гарэлі, вочы блішчалі. Яны гатовы былі слухаць яго бясконца... Фізічна моцны, з энергічнымі рысамі твару і пышнай чорнай чупрынай, ён быў увасабленнем жыццярадаснасці...»* Дарэчы, дзед Харыка быў гэткім традыцыйным «дыджэем» на вяселлях, так што было ад каго пераняць дар слова.

Ізі Харыка расстралялі ў Мінску, у кастрычніку 1937 года, з дзясяткамі іншых літаратараў і навукоўцаў...

*«Век настане такі:*
*ўсім на зайдрасць вякам,*
*А ні я, а ні ты —*
*будуць іншыя там...*

*Мне ўсё роўна:*
*ён знойдзе, мой сын,*
*альбо не —*
*Акрываўлены камень*
*у чыстай сцяне».*

Гэта пераклад ягонага верша, напісанага ў 1925-м, здзейснены Рыгорам Бярозкіным.

## Дзядзька кампазітара і буслiныя трывогі

Касцёл, пазбаўлены даху, усё гэткі ж велічны. На ягоным фасадзе захавалася скульптура Маці Божай, якая, схіліўшы галаву, спагадліва пазірае на нас.... А над нішай са скульптурай, на паўкруглай дэталі фасаду на самым версе — буслінае гняздо.

Прайсці на касцёльную тэрыторыю было абавязкова — тут захаваліся могілкі. Шэрыя надмагільныя камяні пахіліліся, некаторыя схаваліся ў густой траве, нагадваючы рэшткі разбітых караблёў, пакінутых жорсткімі хвалямі часу на паверхні. Я люблю хадзіць у такіх мясцінах, расчытваючы, што можна, вызваляючы надпісы ад гразі і моху... Вось на невысокім шэрым камені, калі адхінуць траву, чытаецца: «Адам Манюшка. Нарадзіўся 12 сакавіка 1796 года, памёр 14 кастрычніка 1881-га».

Знакамітае для Беларусі прозвішча... Вядома, закарцела даведацца, ці не сваяк Станіславу Манюшку, аўтару першай беларускай оперы на лібрэта Дуніна-Марцінкевіча?

Аказалася, сваяк! Ягоны родны дзядзька. Валодаў маёнткам Замошша, быў чалавекам прагрэсіўным. Сялян адпусціў на волю, для работы наймаў іх за грошы. За ўдзел у паўстанні 1863 года маёнткі падлягалі канфіскацыі. Здаецца, пан Адам схітрыўся пазбегнуць гэтага, перапісаўшы маёмасць на жонку Эмілію. У маёнтку ўжываў купленыя ў Еўропе паравыя рухавікі.

Вядома, Станіслаў Манюшка не мог не бываць у гасцях у роднага дзядзькі... І тут вымалёўваецца цікавая гіпотэза, чаму ў Зембінскім касцёле аказаліся карціны Яна Дамеля: мастак быў сябрам і Дуніна-Марцінкевіча, і Станіслава Манюшкі, уваходзіў у кола прагрэсіўнай мінскай інтэлігенцыі... Асабліва сябраваў з Дамелем бацька Станіслава Манюшкі Чэслаў, які сам маляваў. Вось і склалі Дамелю пратэкцыю ў Зембіне, тым больш Дамель меў патрэбу ў грашах пасля адбыцця двух гадоў у сібірскай высылцы з-за падазрэння ў падробцы фальшывых банкнот.

Сёння ў касцёле растуць дрэвы, валяюцца бэлькі.

Кажуць, калі тут стаялі напалеонаўскія салдаты, моцна папсавалі будынак. Магчыма... А вось што Напалеон у гэтым храме начаваў — гэта наўрад ці, не супадае па датах... І генерала французскага побач не пахавалі, як гаворыць паданне, — усё ж яны пералічаныя ўсе, генералы.

## Пакарыцелька Парыжа

Розныя эпохі прайшліся па храме... Сёння цяжка ўявіць, што ў 1813-м ён выглядаў так: *«Касцёл франтонам стаіць да вуліцы, мае ў даўжыню 52 сажні, у шырыню 34. З боку галоўнага фасада трохвугольны франтон завяршаецца крыжам жалезным, каля якога знаходзяцца каменныя вазоны. Дах касцёла гонтавы, над прэзбітэрыем — купал, у якім вісіць сігнатурка, завяршаецца жалезным крыжам. Купал знізу пакрыты гонтаю, а зверху бляхаю пакрыты».*

Замест купала сёння — неба...

Дарэчы, немагчыма, знаходзячыся ў Зембіне, не ўспомніць яшчэ аднаго мастака з французскай тэматыкай... Дакладней, мастачку — Надзею Хадасевіч-Лежэ, ураджэнку гэтых мясцін. Амбіцыйная дзяўчынка, не маючы магчымасці нават бачыць выдатныя карціны, малявала вугалем на печы, мясцовая дзятва дражніла: «Надзька, давай Парыж!» І Надзя дала... У складаныя рэвалюцыйныя часы рушыла ў свет, вучыцца... У Смаленску яе выкладчыкам стаў Казімір Малевіч. Перабралася ў Варшаўскую акадэмію, трапіла ў Парыж... Заваявала прызнанне. Стала жонкай французскага мастака Фернана Лежэ...

Іван Міско, народны мастак Беларусі, неаднойчы расказваў пра Надзю, якая прыязджала з Францыі ў Савецкі Саюз... Скульптар ляпіў яе з натуры і дасюль марыць паставіць помнік ёй у Зембіне. Як апісвае сваю задуму Іван Акімавіч, *«Скульптура вышынёй два метры дваццаць сантыметраў, на гранітным валуне побач з музеем... Я выявіў мастачку такой, якой яна была. На адным плячы — дарагое футра, яна так любіла насіць. Жанчына валявая, тэмпераментная. Надзя распавядала: у дзяцінстве магла ўсю ноч не спаць, зубамі трымалася за парэнчы ложка, каб давесці: «Я не сплю». Выдатны тыпаж».*



У зембінскім Музеі народнай славы ёсць мазаікі Надзі — трапілі сюды цудам... Надзя шчодра перадавала свае і мужавы работы ў Савецкі Саюз. Мазаікі ўстанавілі ў падмаскоўным горадзе Дубна... Але праміную час, пачалі псавацца... Колішні дырэктар зембінскага Дома культуры Эдуард Чарняўскі адправіўся па мазаікі на машыне — і неяк даставіў...

## Дзеля некалькіх секундаў на экране

На развітанне спыняемся перад абразком і лампадкай у шчарбіне сцяны касцёла... Што ж, храм жывы, пакуль хтосьці ў ім моліцца. А мы кіруемся да яшчэ аднаго адметнага будынка — гэтым разам царквы Святога Міхаіла. Як часта здараецца, на адным і тым жа месцы храмы ўзводзіліся, гінулі, перадаваліся з канфесіі ў канфесію... Гэты ўзведзены ў 1904-м па праекце вядомага архітэктара Віктара Струева. Пацярпеў таксама шмат... Падчас Вялікай Айчыннай вайны званіцу і храм выкарыстоўвалі фашысцкі гарнізон. Тут была і турма для тых, хто змагаўся з акупантамі. У ваколіцах дзейнічала партызанская брыгада знакамітага «дзядзькі Колі» — Героя Савецкага Саюза Пятра Лапаціна.

Дарэчы, вёску Замошша, якой валодаў калісьці Антон Манюшка, гітлераўцы спалілі ў ліпені 1942-га разам з жыхарамі.

Пасля вайны напаўразбураную царкву пачалі аднаўляць... Але ў 1965-м тут здымалі кінафільм «Пераклічка». Акцёры славутыя — Алег Стрыжэнаў, Марыяна Вярцінская, Тацціяна Доранiна, Яўген Сцяблоў, Мікіта Міхалкоў. Рэжысёру закарцела зняць сцэну, як савецкі танк прабівае алтарную сцяну храма, у якім заселі фашысты. Ролю камандзіра танка выконваў малады Мікіта Міхалкоў.

Тады тут, як кажуць мясцовыя жыхары, было збожжасховішча... Карацей, не шкада «культавага збудавання».

Магутная сцяна ніяк не паддавалася напору танка. Тады яе вырашылі ўзарваць і зрабіць бутафорскую «накладку». Сцэна была знятая... Заадно танк праехаўся па магілках каля царквы. Магілы і крыжы для здымак зладзілі бутафорскія, але ж пад імі знаходзіліся рэальныя пахаванні вернікаў.

Храм аднавілі ўжо ў наш час — цёмна-чырвоныя сцены, белая аздоба, залатыя купалы... Насупраць — невялікі драўляны будыначак. Як сведчыць шыльдачка, надкладзеная капліца збудавана майстрам Андрэем Чарнухам да асвячэння храма св. Архангела Міхаіла ў вёсцы Зембін 16 лістапада 2014 года. У капліцы — студня, абліцаваная прыгожымі каванымі дэталямі... Што ж, глыток вады са святой крыніцы — найлепшае развітанне...

Зембін, мястэчка, убачанае сур'ёзнымі вачыма, мае шмат лірычных уступаў і гістарычных пралогаў...

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Шануй сваё!

# КУБАЙКІ, СТРЫНГ-АРТ І БАТЛЕЙКА НА МАГНІТАХ

## Жанчыны выбіраюць сімвал мужчынскага пачатку

**На выстаўку-кірмаш «Чароўны млын» хтосьці ходзіць па ўнікальныя падарункі, якія не знойдзеш у звычайнай краме, хтосьці — па натхненне. Мы ж пайшлі, каб паглядзець, што цікавае, звязанае з нацыянальнымі традыцыямі сёння прапануюць беларускія майстры.**

Апошнім разам на «Млын» я завітвала гады два таму. І, шчыра прызнацца, тады вырабаў з нацыянальным каларытам было значна больш.

— Раней было больш турыстаў, ды і нашы людзі часцей ездзілі за мяжу, таму і попыт на вырабы, аздобленыя арнаментамі, выцінанкай, быў большы, — тлумачыць рамеснік з Мінска Дзмітрый БОХАН.

Дзмітрый працуе з дрэвам. Вырабляе прыгожыя падносы, свяцільні. А таксама выразае асновы бірулек, падставак для сурвэтак ды мабільнага тэлефона, якія жонка аздабляе ў тэхніцы «дэкупаж». На многіх — беларускія арнаменты ды выцінанка. Робіць сямейная пара і «вечныя» календары з назвамі месяцаў, у тым ліку і на роднай мове.

— Мы б з радасцю рабілі календары выключна беларускамоўнымі, — кажа Дзмітрый. — Галоўнае, каб куплялі...

Раман ЧАРКАШЫН з Віцебска вось ужо больш як 10 гадоў вырабляе стыльныя наручныя гадзіннікі, у тым ліку з беларускім арнаментам. Швейцарскі механізм, корпус з цукровага клёну, арнамент і ўстаўкі на цыферблаце зробленыя з афрыканскага дрэва — падук. Ёсць і гадзіннікі з арнаментам, які свеціцца ў цемры. Эфект дасягаецца пры дапамозе адмысловай эпаксіднай смалы.







— Мой першы гадзіннік, дарэчы, быў з беларускага дубу з зялёным арнаментам, — згадвае майстар. — Пастаянна эксперыментую. Магу зрабіць любы гадзіннік на заказ. Вы можаце выбраць пароду дрэва, механізм, заказаць любую гравіроўку на цыферблаце. Можам зрабіць падарункавую драўляную скрынку.

Каштуе такі дызайнерскі гадзіннік 248 рублёў, той, што свеціцца, — 198.

Аляксей ШКІРМАН прыехаў на кірмаш разам з сястрой Марынай з Бабруйска. Майстры прывезлі з сабой арыгінальныя падарункавыя наборы для вышывання ўпрыгажэнняў у тэхніцы мікравышыўкі. У набор уваходзяць інструкцыя, падушачка, канва, нітка, іголка, аснова для кулона (брошкі, бранзалета), рэкамендацыі па доглядзе.

— Фурнітура і ніткі — якасныя, можна не баяцца, што нешта пацямнее ці аблезе, — пераконвае Аляксей. — Марына і яе муж Дзмітрый вышываюць прафесійна, а я прыдумаў ідэю з абярэжнымі сімваламі. Вельмі адгукаецца ўва мне гэтая тэма. Сам я толькі адзін кулон вышыў у сваім жыцці — сімвал багацця *(паказвае)*. Так што з мікравышыўкай справіцца nават навічок.

— Чаму вырашылі зрабіць такія наборы? — цікаўлюся. — Можна ж было прадаваць выключна гатовыя вырабы.

— Каб сімвал меў абярэжную сілу, трэба вышыць яго сваімі рукамі, — усміхаецца Аляксей.

— Ці рукамі любімага чалавека, — дадала Марына.

Юлія КУРЛЕНЯ працуе ў цікавай тэхніцы стрынг-арт. З дапамогай малатка, рознакаляровых нітак і маленькіх цвікоў стварае малюнкі на дрэве. Гэтая тэхніка прыдуманая ў Англіі ў XVI стагоддзі. Пры дапамозе цвікоў і нітак англійская даследчыца Мэры Буль вучыла дзяцей геаметрыі. Сярод работ Юлі ёсць і беларускія абярэжныя сімвалы.

— У школьныя гады я выступала ў народным ансамблі, таму мне беларуская сімволіка не чужая. Ды і попыт ёсць. Адзін мужчына сам выбіраў абярэгі, якія павесіў над дзвярыма ў сваім доме. Сярод абярэгаў жанчыны чамусьці часцей за ўсё выбіраюць агонь — сімвал мужчынскага пачатку. Даводзілася вышываць дэкаратыўнае пано ў выглядзе зубра, яго павезлі ў падарунак беларусам ажно ў Шры-Ланку. Аднойчы заказаць карту Беларусі з надпісам «Месца, дзе цябе заўсёды чакаюць». На міжнацыянальнае вяселле рабіла фотарамкі, дзе контуры сцягоў дзвюх краін перакрыжоўваліся.

Шмат майстроў на кірмашы прапаноўвала стыльнае адзенне з ільну.

— Цяпер у модзе льняныя кардыганы, — кажа Таццяна САЛДАЦЕНКА. — Кожны мой выраб — адзіны і непаўторны. Пагадзіцеся, не вельмі прыемна жанчыне, якая сядзіць у прэзідыуме ў першым радзе (а я шыю ў тым ліку і для беларускіх віп-персон), сустрэць калегу ў такім жа касцюме.

Таццяна шые ўсё жыццё. Мела справу з рознымі тканінамі, у тым ліку і з замежным ільном. Паводле яе слоў, беларускі лён — найлепшы ў свеце.

Вельмі мне спадабаліся экапрынты «Дыханне траў» на тонкім ільне, зробленыя Марынай Гушчай. А таксама габелены з сушаных траў і кветак, якія вельмі эфектна будуць глядзецца на сцяне. Чым не альтэрнатыва карціне?

— Традыцыя плесці і ткаць цыноўкі з траў дайшла да нас з глыбокай даўніны, — распавядае майстрыха Юлія ГАРДЗЕЙКА. — Збіраць травы і плесці з іх — суцэльнае задавальненне. На працягу ўсёй работы цешышся водарам траў і кветак. Зялёны дыванок можна ткаць і з лекавых зёлак. Такі габелен напоўніць дом водарам лета і створыць утульнасць. Ведаеце, што першае робяць людзі, калі бачаць такі габелен? Праводзяць па ім рукой. Так далікатна гладзяць, каб кожная траўка паспела «павітацца». А потым утыкаюцца ў яго носам і ўдыхаюць пах. І тут ужо ў кожнага свае ўспаміны...

Ну і, вядома, які «Млын» без вышыванак ды вышымаек?! Да іх дадаліся і прыкметы часу — маскі з валошкамі і беларускім арнаментам.

— Мы прадаём рознае адзенне, але вышымайкі заўсёды па попыце на першым месцы, — кажа прадстаўнік Fainy.by Ігар КАРАЛЁЎ. — Мая любімая тэма — валошкі. Калі былі Алімпійскія гульні, спартсмены з Эстоніі скупілі ў нас усе вышымайкі з валошкамі. Аказваецца, яны таксама лічаць валошку нацыянальнай кветкай. Мы не стаім на месцы, эксперыментуем не толькі з відамі арнаменту, але і з яго колеравай гамай. Вось, напрыклад, гэтая валошка мае ажно 18 адценняў аднаго колеру. Самы ж папулярны сярод нашых пакупнікоў арнамент — «жыццё».

Ігар Каралёў распавёў, што напярэдадні Купалля адна страхавая кампанія закупіла ў іх вышымайкі на ўвесь калектыў. «Таксама ганарымся, што «Песняры» выступаюць у нашых вышыванках».

Прыемна сустракаць на кірмашы і новыя маладыя твары. Ян Косцік займаецца адзеннем з вышыўкай зусім нядаўна. Працуе ў тандэме з татам, які прафесійна шые. Пачыналі з рынка ў Ждановічах. Цяпер у іх ёсць свая крама, дзе прадаюцца вышыванкі на кожны дзень: ільняныя жаночыя сукенкі, байкі, кубайкі (куртка-байка) з нацыянальнай вышыўкай... Ян сам з задавальненнем носіць вышыванкі, зробленыя ўласнымі рукамі. Кошт такога адзення да 100 рублёў.

Яшчэ мне вельмі спадабалася ідэя, якую ажыццявілі ў дэкрэтным водпуску дзве маладыя мамы. Вікторыя і Зоя прыдумалі набор для тэатра ценяў «Батлейка». У тэатры 18 фігур казачных герояў на магнітнай аснове. Яны лёгка прымацоўваюцца да адмысловага экрана. З іх дапамогай можна разыграць адну з чатырох папулярных казак — «Рэпка», «Калабок», «Церамок», «Курачка-раба» ці прыдумаць сваю гісторыю. Мы з мужам такую батлейку падарылі на дзень нараджэння сваёй хрэсніцы. Якраз нядаўна ездзілі да Івонкі ў госці, паказвалі дзеткам ценявы спектакль. Малыя былі ў захапленні.

